Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 ВЕРАСНЯ 2017 г. АЎТОРАК №175 (28539)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Чаму мядзведзі выходзяць «у людзі»?

СТАР. 7



Як пражыць дзень без аўто?

СТАР. 8



Новы Запавет надрукавалі па-беларуску

СТАР. 10

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Васіль МАЦЮШЭЎСКІ, першы намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Сёння змяніліся прыярытэты ў сельскагаспадарчай галіне. Калі раней стаяла задача накарміць насельніцтва, то цяпер спажывец дыктуе свае ўмовы. Рынкі становяцца ўсё больш і больш канкурэнтнымі, і менавіта спажывец — а не гандлёвыя сеткі і вытворцы — фарміруе попыт, бо толькі ён ведае, якой якасці, па якой цане і што ён хоча купляць і спажываць. Таму задача вытворчасці і гандлю — адпавядаць узроўню запытаў насельніцтва».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.09.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9232 | ▲ |
| Еўра | 2,3108 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0336 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0739 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X





Фота БЕЛТА.

# Разам з асілкамі, рыцарамі і... танцуючым батонам



## Сталіца адзначыла Дзень горада

**Па апошніх статыстычных даных у Мінску налічваецца амаль 1 мільён 975 тысяч жыхароў. На святкаванні Дня горада складалася адчуванне, што на вуліцы выйшлі абсалютна ўсе жыхары і нават больш. І гэта невыпадкова, бо паглядзець сапраўды было на што — ад спаборніцтваў на сілу і спрыт да асобнага свята, прысвечанага хлебу.**

### «НУ ЯШЧЭ ПЯЦЬ ХВІЛІНАЧАК!»

Асноўнай пляцоўкай па традыцыі стала тэрыторыя каля Палаца спорту. Непадалёк менавіта ад гэтага месца яшчэ стагоддзі таму разгортвалася ўсё гарадское жыццё. Вось і ў гэтую суботу там узнік нават не асобны горад свята, а практычна цэлая ўрачыстая дзяржава.

Самымі першымі ў «прызначаным месцы» пачалі збірацца сем'і з маленькімі дзецьмі і людзі старэйшага пакалення — тыя, хто ў адрозненне ад моладзі прывык пачынаць свой дзень з самай раніцы. Дарэчы, сярэдні ўзрост жыхароў Мінска — 38 гадоў, прычым жанчыны ў гэтым «рэйтынгу» на пяць гадоў старэйшыя за мужчын. Нездарма на Дні горада было так шмат забавак для мужчын, якія на працягу ўсяго жыцця застаюцца ўнутры дзецьмі.

Так, з асаблівым захапленнем і хваляваннем яны сачылі за тым, як спаборнічаюць пажарныя-ратавальнікі з усёй Беларусі і іншых краін.

СТАР. 3



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Інфармацыйнае грамадства

# Паляванне на Wi-Fi

## На вакзалах ужо ёсць, а метро «маўчыць»

**Нарэшце, спраўдзілася. На вакзалах краіны сапраўды запрацаваў бясплатны Wi-Fi, а месцамі нават і нядрэнна. За месяц, паводле інфармацыі Беларускай чыгункі, ім скарысталіся, праўда, пакуль толькі крыху больш за 50 тысяч чалавек. Прычым у асноўным людзі падключаліся з вакзала станцыі Мінск-Пасажырскі. Там зарэгістравалі каля 15 тысяч унікальных карыстальнікаў — гэта прыкладна па 500 чалавек на дзень.**

### НА МІНСКІМ ВАКЗАЛЕ ЗЛАВІЛІ

Калі аналізаваць усю тройку лідараў па падключэнні, то яна будзе выглядаць наступным чынам: на другім месцы вакзал станцыі Брэст-Цэнтральны, дзе паслугай скарысталіся больш за 4,75 тысячы чалавек, на трэцім месцы вакзал станцыі Гомель — больш за 3,5 тысячы падключэнняў. Статыстыка пакуль, вядома, не здзіўляе лічбамі, але гэта толькі першы месяц карыстання. Таксама не ўсе ведаюць пра тое, што на вакзалах цяпер цалкам бясплатна можна, праходзячы міма, спыніцца і «завіснуць» на гадзінку, каб паглядзець эпізод якога-небудзь серыяла. Дарэчы, гэта магчыма зрабіць на тэрыторыі ўсяго будынка ў Мінску і Брэсце, дзе налічваецца 103 пункты доступу. Зайсці ў сетку можна ў залах чакання і холах, а таксама ў пакоях адпачынку.

СТАР. 5



Фота БЕЛТА.

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ЛЯДОЎНЮ АБО ВЯНДЛЯРНЮ

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2017 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Блізкая ўлада

# ВЫСЛУХАЦЬ І ДАПАМАГЧЫ

## Наталля Качанава правяла прыём у Віцебскай вобласці

**Кіраўнікі мясцовых органаў улады, прадпрыемстваў і арганізацый павінны як мага часцей сустракацца з насельніцтвам. Як паведамляе БЕЛТА, аб гэтым заявіла журналістам кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Наталля Качанава, якая правяла асабісты прыём грамадзян у Шуміліне Віцебскай вобласці.**


Фота БЕЛТА.

На прыём 9 верасня да кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта прыйшлі не толькі жыхары Шумілінскага раёна. Сярод прысутных былі людзі з Віцебска, Полацка, Мінска, Магілёва, Мазыра. Тэмы былі разнастайныя. «Усе агучаныя пытанні могуць быць вырашаны мясцовымі органамі ўлады. Ёсць некалькі зваротаў, якія датычацца работы праваахоўных органаў. Яны будуць уважліва разгледжаны», — сказала Наталля Качанава. Яна дадала, што практычна на кожным прыёме грамадзян узнімаюцца праблемы, звязаныя з абаротам наркатычных сродкаў. «Мы вельмі сур'ёзна ставімся да пытанняў барацьбы з ужываннем і распаўсюджваннем наркотыкаў. Вынікі ёсць. Паводле статыстыкі, такіх злачынстваў у кожным рэгіёне становіцца менш, — падкрэсліла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Тут важная прафілактыка, папярэджанне. У гэтым напрамку актыўна павінна працаваць і сістэма адукацыі, і праваахоўныя органы».

Звароты таксама датычыліся добраўпарадкавання вулічных спартыўных пляцовак, ліўневай каналізацыі, работы лазняў, якасці аказання стаматалагічнай дапамогі. Жыхар вёскі Мікалаева Шумілінскага раёна папрасіў садзейнічання ў пытанні выдзялення крэдыту для набыцця навяснога абсталявання да трактара. Сутнасць праблемы такая — сямейная пара сур'ёзна займаецца сельскагаспадарчай вытворчасцю. На падворку ўтрымліваецца 20 кароў. Каб абслугоўваць такую гаспадарку, неабходна апрацоўваць зямлю, вырошчваць корм. Без механізацыі тут не абысціся. Добрай падмогай у рабоце быў бы прэс-падборшчык. Уласных сродкаў для куплі тэхнікі ў вяскоўцаў няма, патрэбны крэдыт. Але банк не змог выдзеліць грошы, паколькі прэс-падборшчык не ўваходзіць у пералік тэхнікі, набыццё якой магчымае за кошт крэдытных сродкаў Белаграпрамбанка, што выдзяляюцца на развіццё асабістай падсобнай гаспадаркі.

Наталля Качанава адзначыла, што людзей, якія працуюць на зямлі, трэба ўсяляк падтрымліваць, і даручыла банку разабрацца з праблемай — знайсці магчымасць дапамагчы ў набыцці неабходнага абсталявання ■

## • Тым часам

**Адміністрацыя Прэзідэнта працягвае на планавай аснове ажыццяўляць выязныя прыёмы грамадзян у рэгіёнах. З 12 па 15 верасня 2017 года прыёмы пройдуць у Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай, Магілёўскай абласцях, а таксама ў Мінску па наступным графіку:**

**12 верасня** з 10 да 13 гадзін у **Жлобінскім райвыканкаме** прыём будзе весці КАТУШКІН Пётр Пракоф'евіч, галоўны саветнік упраўлення пісьмовых і электронных зваротаў галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб.

**13 верасня** ў **Навагрудскім райвыканкаме** з 14 да 16 гадзін прыём правядзе РАЎНЕЙКА Сяргей Васілевіч, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці, а ў **Мсціслаўскім райвыканкаме** з 10 да 12 гадзін ЛАЎРАНКОЎ Генадзь Міхайлавіч, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці, правядзе прамую тэлефонную лінію, а з 12 да 14 гадзін — асабісты прыём. У гэты ж дзень у **Горацкім райвыканкаме** з 11 да 13 гадзін на прыём можна трапіць да БАБІЦКАГА Аляксея Уладзіміравіча, намесніка начальніка ўпраўлення пісьмовых і электронных зваротаў галоўнага ўпраўлення па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб.

**14 верасня** ў **Калінкавіцкім райвыканкаме** з 10 да 13 гадзін будзе працаваць на прыёме ШУЛЕЙКА Юрый Вітольдавіч, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці, а СКАЛАБАН Святлана Аляксандраўна, намеснік начальніка галоўнага эканамічнага ўпраўлення — начальнік упраўлення развіцця рэгіянальнага патэнцыялу, з 10 да 13 гадзін правядзе прыём у **Івацэвіцкім райвыканкаме.**

**15 верасня** з 10 да 13 гадзін Наталля Уладзіміраўна КРАСАЧКА, намеснік начальніка галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення — начальнік упраўлення сацыяльнай палітыкі, будзе праводзіць прыём у адміністрацыі **Фрунзенскага раёна сталіцы,** а з 11 да 13 гадзін у **Расонскім райвыканкаме** будзе працаваць галоўны саветнік упраўлення ідэалогіі і інфармацыйнай палітыкі галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Наталля Міхайлаўна МАРЧАНКА.

***Запісацца на прыём можна па тэлефонах аддзелаў па рабоце са зваротамі грамадзян адпаведных выканаўчых камітэтаў і раённых адміністрацый г. Мінска. Тэлефоны адміністрацыі Фрунзенскага раёна г. Мінска: 204-30-64, 204-33-26.***

■ На думку парламентарыя

# Пакуль не хапае канцэнтрацыі

## Дэпутат, які мае самае прамое дачыненне да спорту, ацаніў гатоўнасць да Еўрагульняў-2019



**Два гады — гэта не так шмат, як можа падацца на першы погляд. Прыкладна столькі засталося да прыняцця Беларуссю другіх Еўрапейскіх гульняў. Наколькі Мінск і беларускія спартсмены гатовыя да гэтай падзеі, са «Звяздой» падзяліўся меркаваннямі Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы, старшыня грамадскага аб'яднання «Беларуская федэрацыя лёгкай атлетыкі».**

***— На вашу думку, што трэба зрабіць, каб нашы спартсмены паказвалі лепшыя вынікі?***

— Як прафесійны спартсмен, дакладна ведаю, што няма лепшага рэцэпта, чым праца. Няхай гэта прагучыць банальна, але гэта дзейсна. І наколькі аддаюцца спартсмены сваёй справе, наколькі імкнуцца да перамогі, настолькі яны і будуць паспяховымі.

Абвінаваціць лёгкаатлетаў у тым, што яны недапрацоўваюць, я не магу. Так, у Лондане мы не заваявалі медалёў, за што падверглiся справядлівай крытыцы. У сацыяльных сетках я ўжо папрасіў за гэта прабачэння. Бо ў нас сапраўды былі атлеты, у якіх верылі, якія рэальна маглі атрымаць медалі, але не зрабілі гэтага. Сказаць, што яны не працавалі, — значыць схлусіць. Бо праз тыдзень-паўтара на Сусветнай універсіядзе беларускія атлеты ўсё ж такі паказалі вынікі на ўзроўні медалёў чэмпіянату свету.

Адным словам — атлеты гатовыя. Іншае пытанне, што ў пэўны момант павінен сысціся шэраг умоў для поспеху: добрая форма, псіхалагічны і фізічны стан. Гэта падчас марафону можна скарэктаваць штосьці, бо бег адбываецца не адну хвіліну. А калі гэта кіданне молата ці скачок з шастом, увесь працэс займае якраз дзясятак секунд. Магчыма, канцэнтрацыя ўсіх сваіх магчымасцяў у пэўны момант — адзінае, што пакуль у нас недастаткова рэалізоўваецца. Але гэта пытанне ўжо не толькі да спартсменаў, але і да трэнераў ды навукоўцаў.

Наш галоўны экзамен — гэта Алімпійскія гульні ў Токіа ў 2020 годзе. Але спартсмены павінны добра сябе паказаць і на дамашніх буйных спаборніцтвах, такіх як Еўрапейскія гульні — 2019, каб дастойна прадставіць сваю краіну.

***— Як думаеце, дадатковыя фінансавыя ўліванні могуць паўплываць на колькасць атрыманых медалёў?***

— Не ўсё ў грашах вымяраецца. Я калісьці трэніраваўся ў падвале, у гаражы. У мяне былі зборы, грошы на тое, каб на іх пабываць, дзяржава выдзяляла. Але гэта не галоўнае, бо для трэніровак нічога асаблівага з боку не патрабавалася. Справа ў матывацыі.

Калі б зараз лёгкай атлетыцы дадаткова далі грошы, мы б іх скіравалі ў тыя галіны, дзе яшчэ належыць узмацніцца. Але і таго, што ёсць цяпер, нам хапае.

***— Як увогуле можаце ацаніць гатоўнасць інфраструктуры да прыняцця гульняў?***

— Яна ў добрым стане, бо без гэтага нам бы ніхто не даверыў правядзенне Еўрагульняў. Напрыклад, ужо збудавана Мінск-Арэна. Зараз яна выглядае так, нібы толькі здадзена, — зусім як новая. Бо зроблена якасна, прыгожа, функцыянальна, сучасна. І такіх аб'ектаў у сталіцы нямала.

***— Якім чынам прыняцце буйных спартыўных спаборніцтваў уплывае на пазнаванне краіны ў свеце?***

— Вядома, што станоўча. У мяне ёсць цудоўны прыклад. Мы калі выдавалі нумары ўдзельнікам Мінскага паўмарафону, падлічылі, што замежнікаў прыехала каля 1000 чалавек — больш чым з 50 краін. Людзі прыязджаюць не толькі са спартыўнай нагоды, але і паглядзець краіну. Уражаннямі аб культуры, прыродзе, людзях пасля дзеляцца са знаёмымі. Так было і падчас Чэмпіянату свету па хакеі: пра нас нарэшце даведалася шырокае кола замежнікаў. Турысты прыязджаюць да нас па адпачынак, а з'язджаюць з Беларусі з іншым бачаннем яе. Часцей за ўсё ад замежнікаў чую такія водгукі пра нас: чыстая краіна, ветлівыя людзі, высокі ўзровень бяспекі і камфортнасці, даступныя кошты.

Еўрагульні — гэта магчымасць і для саміх беларусаў змяніць у лепшы бок стаўленне да Радзімы. Мяркую, калі ў нашых людзей з'явіцца магчымасць пабачыць ужывую Аліну Талай, Івана Ціхана, Марыну Арзамасаву, Таццяну Халадовіч, гэта мусіць выклікаць гонар за землякоў і краіну ў цэлым.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zvizda.by* ■

■ Погляд

# ІНДЫЙСКІЯ ГАРЫЗОНТЫ



**Чаму Беларусі цікавая Індыя? Некалькі важных фактаў пра краіну дазваляюць вычарпальна адказаць на гэтае пытанне.**

Па-першае, гэта другая па колькасці насельніцтва краіна на планеце, што само па сабе сведчыць пра патэнцыял уплыву на сусветныя пытанні і магчымасці для беларускіх экспарцёраў. У цяперашні момант Індыя адстае ад Кітая на 80 мільёнаў жыхароў. Але, улічваючы высокі ўзровень нараджальнасці ў Індыі і тое, што ў Кітаі ён ужо практычна невысокі — па азіяцкіх мерках, — усё больш зближаецца з еўрапейскім, у наступныя пяць—сем гадоў прагназуецца выхад Індыі на першае месца ў свеце па гэтым паказчыку.

Па-другое, па тэрыторыі Індыя знаходзіцца на сёмым месцы ў свеце, і гэтая тэрыторыя знаходзіцца ў самым хуткарослым рэгіёне свету па эканоміцы — Азіі. Па ўсіх прагнозах, Азія ўпэўнена становіцца цэнтрам сусветнай эканомікі ў наступныя дзесяцігоддзі.

Па-трэцяе, менталітэт насельніцтва Індыі і беларусаў на дзіва падобны, нягледзячы на велізарную адлегласць паміж краінамі. Такія рысы, як талерантнасць, гасціннасць, памяркоўнасць да прадстаўнікоў іншых рас і рэлігій, адсутнасць культу сквапнасці і грошай, адзначаюць замежнікі, кажучы як пра жыхароў Беларусі, так і Індыі.

Па-чацвёртае, у апошнія гады Індыя паскорыла сваё эканамічнае развіццё пасля прыходу да ўлады новага прэм'ер-міністра Нарэндры Модзі. На думку кансалтынгавай фірмы PwC, да 2040 года Індыя апярэдзіць ЗША па аб'ёме ВУП і выйдзе на другое месца пасля Кітая. Чакаецца, што эканоміка Індыі стане расці на 4,9% у год з 2016 па 2050 гг. Гэтаму спрыяе актыўна праяўленае пасля прыходу Модзі да ўлады жаданне вучыцца ў Кітая мерам па прыцягненні замежных інвестыцый, развіццю прамысловасці і барацьбе з карупцыяй.

Па-пятае, з-за высокага ўзроўню нараджальнасці краіна маладая, больш як палова насельніцтва маладзейшыя за трыццаць гадоў, што відавочна адлюстроўвае магчымыя перспектывы развіцця Індыі.

Па-шостае, з-за вышэйзгаданых паказчыкаў па памерах насельніцтва і тэрыторыі прадстаўнікі Індыі прысутнічаюць у вялікай колькасці ва ўсіх міжнародных арганізацыях, важных для Беларусі, і нашай краіне трэба падтрымліваць з ёй цёплыя адносіны.

Па-сёмае, шэраг галін эканомікі Індыі выйшаў на сусветны ўзровень, маючы тэхналогіі і патэнцыял, відавочна цікавыя для мадэрнізацыі Беларусі. Космас, фармацэўтыка і інфармацыйныя тэхналогіі, добра развітыя ў Індыі, важныя і для перспектыў трансфармацыі Беларусі па жаданым узоры.

У сваю чаргу, Беларусь у Індыі ведаюць як еўрапейскую краіну, якая з'яўлялася часткай былога СССР, з якім у Індыі былі нармальныя рабочыя адносіны ў міжнародных арганізацыях. Хоць фармальна Індыя не далучалася да розных альянсаў з СССР, знешняя палітыка краіны па многіх напрамках была сугучная савецкай, у прыватнасці па падтрымцы дэкаланізацыі і барацьбе за мірныя метады ажыццяўлення знешняй палітыкі. Прамысловыя тавары з Беларусі паступалі на індыйскі рынак, што робіць яго больш знаёмым для беларускіх вытворцаў.

Трэба адзначыць, што ў апошнія гады цікавасць да Беларусі значна ўзрасла ў сувязі з тым, што быў створаны Еўразійскі эканамічны саюз. Беларусь як частка агульнай эканамічнай прасторы з Расіяй, Казахстанам, Арменіяй і Кыргызстанам выглядае прывабна. На парадку дня заключэнне пагаднення аб зоне свабоднага гандлю (ЗСГ) паміж ЕАЭС і Індыяй. На Пецярбургскім міжнародным эканамічным форуме 3 чэрвеня 2017 года адбылося падпісанне сумеснай заявы аб пачатку перагавораў па заключэнні гэтага пагаднення. Неабходна разумець, што перагаворы будуць весціся дастаткова доўга, але сам факт іх пачатку рэзка павысіў цікавасць да Беларусі з боку індыйскага бізнесу, чым неабходна скарыстацца.

Якія магчымасці адкрыюцца для беларускіх экспарцёраў пасля яго падпісання? У 2016 годзе скончыла работу сумесная група ЕАЭС і індыйскага ўрада, якая праводзіла даследаванне аб мэтазгоднасці заключэння пагаднення аб ЗСГ. Праведзены аналіз прадэманстраваў, што ўзаемная лібералізацыя гандлёвага рэжыму прывядзе да росту ВУП усіх краін ЕАЭС і Індыі ўжо ў кароткатэрміновай перспектыве. Па экспертных ацэнках, пры пераходзе на рэжым свабоднага гандлю тавараабарот можа вырасці да 30—40% ад бягучага ўзроўню ў залежнасці ад глыбіні тарыфнай лібералізацыі, якая будзе дасягнутая па выніках перагавораў. Чакаецца значнае павелічэнне экспарту сельскагаспадарчай прадукцыі з краін ЕАЭС у Індыю, чым павінна скарыстацца і Беларусь, якая імкнецца дыверсіфікаваць свой харчовы экспарт. Адкрыюцца і новыя магчымасці па пастаўках на індыйскі рынак тавараў прамысловай групы, у прыватнасці ўгнаенняў, машын і абсталявання, транспартных сродкаў, некаторых відаў турбарэактыўных рухавікоў, солі, вырабаў са сталі, драўніны, хімікатаў, гумы, пластмасы. Відавочна, што беларуская эканоміка будзе здольная нарасціць экспарт па многіх з гэтых пазіцый, выкарыстоўваючы існуючы патэнцыял.

Можна чакаць, што візіт кіраўніка беларускай дзяржавы ў Індыю з вялікай дэлегацыяй, правядзенне напярэдадні маштабнага бізнес-форуму, вынік якога — падпісанне дзясяткаў кантрактаў, яшчэ больш павялічаць цікавасць да Беларусі з боку ўрадавых структур і бізнесу гэтай краіны.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук** ■

# Разам з асілкамі, рыцарамі...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Атрымаўшы зарад бадзёрасці, можна было адправіцца адпачыць душой да галоўнай сцэны. За напеўнымі народнымі кампазіцыямі ў харавым выкананні ішло дэфіле ў вытанчаных сукенках, а за запальнымі індыйскімі танцамі — песні сучасных выканаўцаў.

Больш за ўсіх радаваліся магчымасці павадзіць масавыя карагоды проста перад сцэнай, вядома ж, дзеці. Тым больш што кампанію ім складаў... вясёлы танцуючы батон. Дарэчы, там жа быў і не менш радасны самавар. Не варта здзіўляцца! Паблізу праходзіла па-сапраўднаму восеньскае свята хлеба. Гэта пляцоўка была адной з самых шматлюдных. Гасцям прапанавалі паласавацца тут разнастайнымі традыцыйнымі і незвычайнымі прысмакамі з мукі. У тым ліку і, спачатку палюбаваўшыся, атрымаць кавалачак «ядомага» Мінска — вялізнага торта. Аднак не хлебам адзіным — менавіта ў гэтай зоне было мноства інтэрактыўнасцяў, асабліва для юных мінчан.

Тыя, у каго назіранне за конкурсам «Найлепшы пажарны-ратавальнік» толькі распаліла цікавасць да падобных відовішчаў, мог пасачыць яшчэ і за Міжнародным турнірам па сілавым экстрыме Minsk Open Cup, у якім бралі ўдзел сапраўдныя волаты. На адным з першых этапаў, напрыклад, асілкі павінны былі па чарзе перанесці калодзеж, 100 кілаграмовую бочку і гіганцкую покрыўку вагой у 70 кілаграмаў. Як жартаваў вядучы — так правяралася гаспадарлівасць удзельнікаў спаборніцтва: маўляў, якімі карыснымі рэчамі яны змогуць напоўніць свой дом.

## З XXI СТАГОДДЗЯ НАЎПРОСТ У СЯРЭДНЯВЕЧЧА

Толькі ўявіце: за суткі ў Мінску вырабляецца 44 тоны мясных і субпрадуктаў, 66 тон шакаладу і кандытарскіх вырабаў, а таксама малочная прадукцыя з 761 тоны малака. Вось і на фудкорце вочы разбягаліся ад выбару, было ўсё і нават больш — аж да самай сапраўднай салдацкай кашы. А які там лунаў пах...

Насыціўшыся, самы час адправіцца па сувеніры. І зноў тая ж бяда! Калі купіць усё, што спадабаецца воку, можна згалець. Майстры прыехалі не толькі з Мінска, а з усёй краіны, і кожны прывёз на свята толькі самыя лепшыя са сваіх вырабаў. Дзяўчатам асабліва цяжка было праходзіць па гэтых маляўнічых радах. Тут і самыя розныя ўпрыгажэнні, і традыцыйныя вяночкі, і ўборы з нацыянальнымі элементамі... Прыйшоўшы на Дзень горада заўзятай прыхільніцай шопінгу ў суседняй Galleria Minsk, сысці з яго можна было сапраўднай беларусачкай узору Сярэднявечча.




Перамясціцца ў часе можна было і дзякуючы наведванню яшчэ адной буйной пляцоўкі свята — міжнароднага фестывалю гістарычнай рэканструкцыі «Мінск старажытны». Фэст атрымаўся не толькі відовішчным, але і гучным: стук капытоў, звон мячоў і пераможныя крыкі. Калі хоць бы дзесяць хвілін не глядзець на экран смартфона, то і праўда можна адчуць сябе адным з тых самых рыцараў падчас баявога паходу. Шчыра ўлюбёным у іншыя эпохі таксама было дзе разгуляцца. У палатачным гарадку салдаты французскай арміі часоў Напалеона суседнічалі з сёстрамі міласэрнасці са шпіталя Першай сусветнай вайны. Тыя, хто абмяжоўваецца адным здымкам у Інстаграм на год, замест фотасесіі з пераапранутымі гістарычнымі персанажамі лічылі за лепшае слухаць лекцыі пра герояў сапраўдных.



Міжнародны турнір па сілавым экстрыме Minsk Open Cup.

## ГОРАД — ГЭТА ЛЮДЗІ

Вядома, у раёне Нямігі канцэнтрацыя розных забавак была самай высокай, аднак актыўна гуляла ўся сталіца. Ва ўсіх раёнах Мінска былі арганізаваны свае насычаныя святочныя праграмы. Напрыклад, у Фрунзенскім раёне «спявалі і скакалі» ў Парку імя 60-годдзя Кастрычніка, а ў Партызанскім — галоўная весялосць разгарнулася ў Цэнтральным дзіцячым парку імя Горкага. Адной з самых прыгожых і значных раённых пляцовак стала тэрыторыя каля Нацыянальнай бібліятэкі ў Першамайскім раёне. Тыя, хто стаміўся ад шумнага натоўпу, маглі адпачыць непадалёк пад песні сольных выканаўцаў і народных калектываў. Аматары відовішчаў таксама не засталіся пакрыўджанымі: тут жа адпрацоўвалі трукі матацыклісты.

І ўсё ж ва ўсёй разнастайнасці канцэртных праграм, спаборніцтваў і паказальных выступленняў самай значнай падзеяй для горада і, вядома, найбольш кранальнай здаецца аднагасовая рэгістрацыя шлюбу дзевяці пар з усіх раёнаў Мінска. Бо горад — гэта людзі.

Каб не ўдавацца ў залішні пафас, заўважым, што ўступаць у шлюб мінчане не спяшаюцца: у сярэднім хлопцы задаюць пытанне «Ты выйдзеш за мяне замуж?» толькі пасля 28 гадоў, а дзяўчаты адказваюць на яго радасным «Так!» пасля 26. Але галоўнае, што сем'і ўсё ж ствараюцца і ў іх з'яўляюцца дзеткі: Мінск з праблемай адсутнасці натуральнага прыросту насельніцтва не сутыкаецца ўжо даўно. Толькі летась у сталіцы нарадзілася 26,7 тысячы дзяцей, якія, хочацца думаць, у будучыні зробяць усё магчымае, каб свой наступны значны юбілей Мінск адзначыў яшчэ больш урачыста і шматлюдна.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*
**Фота Надзеі БУЖАН.**

# МАШТАБНА, ХУТКА, ЯРКА

## Як сталіца ператварылася ў бегавую трасу

**У нядзелю адбыўся традыцыйны Мінскі паўмарафон, сёлета ён стаў асаблівым, таму што прымеркаваны да юбілею горада. На дыстанцыі ў 5,5, 10 і 21 км выйшлі аматары і прафесіяналы, пачаткоўцы і спартсмены з вялікім стажам, бегчы па вуліцах сталіцы адправілася і карэспандэнт «Звязды».**

Упершыню правесці настолькі маштабныя бегавыя спаборніцтвы наша краіна адважылася ў 2015 годзе. Тады ў іх прыняло ўдзел каля 16 тысяч чалавек з 36 краін, праз год колькасць удзельнікаў склала 20 тысяч, пашырылася і геаграфія — бегаць у Мінск прыехалі прадстаўнікі 42 краін. У верасні бягучага года ўсе рэкорды пабіты — на трасу выйшла больш за 30 тысяч чалавек. Яны прадставілі 4 кантыненты і паўсотні краін.

Гэты спартыўны форум стаў сапраўдным упрыгожаннем святкавання 950-годдзя Мінска, што пацвердзіў і **старшыня Мінгарвыканкама Андрэй ШОРАЦ.**

— Упэўнены, Мінскі паўмарафон зойме годнае месца ў гісторыі горада. Такая колькасць удзельнікаў сведчыць пра папулярнасць спорту, велізарнае жаданне займацца фізічнай культурай. І гарадскія ўлады будуць актыўна падтрымліваць гэта імкненне жыхароў і гасцей сталіцы, — сказаў старшыня.

Дыханне спартыўнага свята з'явілася яшчэ задоўга да старту, які быў прызначаны на 10 раніцы. Здаецца, гэта адзіная нядзеля ў годзе, калі ў грамадскім транспарце сталіцы можна было ўбачыць такую колькасць людзей у спартыўным аддзенні. За гадзіну да пачатку спаборніцтваў каля Палаца спорту, дзе размясціліся старт і фініш, яблыку няма дзе ўпасці — хтосьці пачынае размінку, хтосьці з хваляваннем абмяркоўвае трасу. Час пралятае незаўважна, і вось ужо цэлая чарада бегуноў пад апладысменты і гукі музыкі адпраўляецца на дыстанцыі ў 5 і 10 км. Сёлета арганізатары вырашылі падзяліць удзельнікаў, таму на сапраўдны паўмарафон у 21 км бегуны адправіліся толькі праз дзве гадзіны пасля першых старцёраў.




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

На дыстанцыі нямала знаёмых усёй краіне асоб: вядомыя медыйныя персоны, прадстаўнікі многіх відаў спорту, сярод іх чэмпіёнка свету Марына Арзамасава з мужам і сынам. Сёння для Марыны часавы вынік не галоўнае, спартсменка ў адпачынку, але ўсё роўна вырашыла прыняць удзел у забегу.

— Я вельмі рада апынуцца тут, па ходзе дыстанцыі прыемна пагутарыць з людзьмі, сустрэць знаёмых і проста каторы раз паглядзець на вуліцы свайго горада. Сёння не стаўлю перад сабой ніякіх задач, усё ж я спецыялізуюся не на гэтай дыстанцыі, час за які я пераадолею 5,5 км, застанецца ў тайне, — загадкава ўсміхаецца Марына.

Маршрут 5,5 км у цяперашнім верасні быў не такі, як у мінулыя гады, але арганізатары ўсё роўна пастараліся зрабіць яго максімальна цікавым для ўдзельнікаў. Так, каля цырка нас, бегуноў, сустракалі аніматары, а каля Тэатра оперы і балета — цэлы аркестр. Не кажучы ўжо пра тое, што на працягу ўсёй трасы ўдзельнікаў паўмарафону сваімі апладысментамі і крыкамі падтрымлівалі неабыякавыя мінчане. А на апошнім кіламетры дыстанцыі, калі, здавалася, што сілы ўжо пакідаюць, з'явіліся людзі з плакатамі: «Усміхніся, стане лягчэй», «Фініш побач, ты маладзец!» або «Run, baby, run».

Хутчэй за ўсіх з дыстанцыяй 5,5 км у мужчын справіўся Максім Юшчанка, у жанчын не было роўных Таццяне Шабанавай. Як ні дзіўна, практычна адразу ж на фінішы з'явіўся і першы ўдзельнік «дзясяткі», вядучы ўжо нават назваў яго пераможцам, але неўзабаве высветлілася, што бягун зрабіў несумленна і зрэзаў участак дыстанцыі, што зафіксавала відэакамера. Гэта, вядома, пацягнула дыскваліфікацыю. Такім чынам, пераможцам забегу на 10 км стаў Павел Міхнюк, сярод жанчын першай фінішную стужку перасекла Ірына Сомава.



Карэспандэнт «Звязды» Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ *(злева)* — удзельніца Мінскага паўмарафону-2017.

Паўмарафон прадоўжыўся забегам на 21,1 км, трэба адзначыць, што ў ім прынялі ўдзел шматлікія моцныя афрыканскія і еўрапейскія атлеты. Першае месца ў мужчын, як і гадам раней, заняў кенійскі бягун Кіптум Маё. Ён пераадолеў дыстанцыю за 1 гадзіну 3 хвіліны 19 секундаў. Кенійцу не ўдалося перасягнуць уласнае леташняе дасягненне на Мінскім паўмарафоне мінулага года, тады ён паказаў вынік 1 гадзіна 3 хвіліны 00 секундаў.

— Забегам задаволены. Траса ў Мінску сапраўды аказалася няпростай, не падвяло надвор'е. Адзінае, сустрэчны вецер перашкодзіў паказаць больш высокі вынік, — адзначыў пасля фінішу Кіптум Маё.

Другое месца заняў Бекеле Джыма з Эфіопіі, бронзавая ўзнагарода ў актыве ўкраінца Мікалая Лухімчыка.

А вось у забегу сярод жанчын увесь п'едэстал занялі беларускі. Людміла Ляховіч перамагла з вынікам 1 гадзіна 13 хвілін 53 секунды. Ніна Савіна фінішавала другой — 1 гадзіна 14 хвілін 14 секундаў, замкнула тройку прызёраў Марына Даманцэвіч — 1 гадзіна 14 хвілін 22 секунды.

— Імкнёмся прывіць беларусам культуру бегавога руху, і ў нас, лічу, гэта атрымліваецца, — расказвае **старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ.** — Мінскі паўмарафон набраў папулярнасць. За два дні да старту спынілі выдачу нумароў на 5,5 км, такі высокі быў ажыятаж. Наша каманда старалася ўлічыць усе заўвагі, якія былі па выніках мінулых двух гадоў. Шчаслівы, што ў нас усё атрымалася.

Пераможцы паўмарафону атрымалі па 3 тысячы долараў, а ўсе зарэгістраваныя — сувенірныя медалі. Вадзім Дзевятоўскі падкрэсліў, што па памеры прызавога фонду Мінск не саступае многім з падобных забегаў у Еўропе. Цяпер ён мае бронзавы статус, але будзе імкнуцца да сярэбранага.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

■ Ураджай

# БУДЗЕМ З ХЛЕБАМ!

## Каравай Нясвіжчыны «заважыў» больш чым 143 тыс. тон

**Сёлетняе жніво ў Мінскай вобласці паспяхова завершана. У агульную скарбонку важкі ўклад, як заўсёды, унеслі хлеборобы Нясвіжчыны. У мінулую пятніцу працаўнікі раёна, шматлікія госці сабраліся ў аграгарадку Аношкі, каб адсвяткаваць раённыя «Дажынкі».**



Фота Наталлі ЕРМАШЭНКІ.

Да гэтага мерапрыемства рыхтаваліся загадзя. Добраўпарадкавалі населены пункт усёй талакой. Аношкі сустракалі ўдзельнікаў свята чысцінёй, утульнасцю. Па абноўленых вуліцах прайшла калона: шэсць пераможцаў уборачнай кампаніі неслі сцяг «Дажынак», а дзяўчаты — святочныя каравái.

— Словы самай шчырай удзячнасці кожнаму, хто добрасумленна і адказна працаваў на зямлі, зрабіў усё магчымае, каб вырасціць і сабраць такі знакавы для раёна ўраджай, — павіншаваў прысутных **старшыня Нясвіжскага райвыканкама Іван КРУПКО.**

Несвіжане намалацілі 143 394 тоны зерня. Прычым ураджайнасць склала 65,1 цэнтнера з гектара. Цалкам выкананы дзяржзаказ — 16 тыс. тон збожжа.

— Вынікі работы хлебаробаў — гэта наш гонар. Яны дасягнуты напружанай працай, воляй і прафесіяналізмам усіх земляробаў раёна: механізатараў, камбайнераў, кіроўцаў, спецыялістаў, кіраўнікоў, — падкрэсліў Іван Крупко. — Упэўнены, што працаўнікі сельскагаспадарчай нівы будуць і далей сваімі здабыткамі славіць нашу любую Нясвіжчыну, зробяць усё магчымае, каб з добрымі паказчыкамі завяршыць сельскагаспадарчы год і ўнесці важкі ўклад ва ўмацаванне эканамічнага патэнцыялу Міншчыны і Беларусі.

Павіншаваць працаўнікоў прыехаў і **першы намеснік старшыні Мінаблвыканкама Ігар МАКАР**. Асабліва ён адзначыў поспехі ААТ «Новае жыццё» і СВК «Агракамбінат Сноў». У Снове, дарэчы, зладзілі свае «Дажынкі». Снoўская зямля аддзячыла хлеборобам шчодрым ураджаем. Тут з 2415 гектараў збожжавых намалацілі 23 272,7 тоны зерня. Сярэдняя ўраджайнасць 96,4 цэнтнера з гектара. Гэта самы высокі паказчык у раёне і адзін з найлепшых у краіне. Акрамя таго, 4964 тоны збожжа сабралі на арандаваных землях у Клецкім раёне. У выніку валавы збор склаў 28 тыс. тон.

Усяго ж у Мінскай вобласці, як адзначыў Ігар Макар, сабрана разам з кукурузай больш як 2 млн тон. Сярэдняя

**Несвіжане намалацілі 143 394 тоны зерня. Прычым ураджайнасць склала 65,1 цэнтнера з гектара. Цалкам выкананы дзяржзаказ — 16 тыс. тон збожжа.**

ўраджайнасць збожжавых — 37 цэнтнераў на круг. Ігар Макар уручыў найлепшым працаўнікам узнагароды Мінаблвыканкама. Узнагароды яны атрымалі і ад Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

Падчас «Дажынак» быў падведзены конкурс караваяў ад усіх сельгаспрадпрыемстваў раёна. Працавалі выстаўкі вырабаў народных умельцаў, работ вучняў горада і раёна. Перад прысутнымі выступілі з канцэртам фіналісты прафсаюзнага конкурсу «Новыя імёны Беларусі» і зоркі беларускай эстрады ў межах рэспубліканскай народна-патрыятычнай акцыі ФПБ «Мы — разам».

Што датычыцца раённых «Дажынак», то ў Мінскай вобласці яны праходзяць менавіта ў аграгарадках. І надалей яны будуць ладзіцца ў такім фармаце. Гэта дазваляе добраўпарадкаваць сельскія населеныя пункты. Плануецца, што абласное свята-фестываль сельскіх працаўнікоў пройдзе 7 кастрычніка ў Смалявічах.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ВЕЦЕР З ПОЎНАЧЫ

## Максімальная тэмпература ў сераду будзе толькі 14—21 цяпла

**З сярэдзіны тыдня ў нашай краіне істотна пахаладае, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Праз нашу краіну будзе праходзіць халодны атмасферны фронт. Услед за ім пачне паступаць халоднае паветра з паўночнага захаду Еўропы, што прывядзе да паніжэння тэмпературы, а парывісты паўночны вецер узмоцніць адчуванне холаду.

А сёння ў Беларусі будзе цёпла. У краіне захаваецца цёплая паветраная маса, а па захадзе адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту. Удзень па захадзе нашай тэрыторыі чакаюцца дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Тэмпература паветра ўдзень будзе трымацца ад плюс 23 да плюс 29 градусаў, а ў заходніх раёнах ужо менш — 19—22 цяпла. Далей чакаецца пахаладанне. У сераду на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, днём у асобных раёнах магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 11—18 цяпла, удзень — ад плюс 14 да плюс 21 градуса.

Атмасферныя франты ад цыклона над поўначчу Еўропы будуць кіраваць нашым надвор'ем у чацвер. Уначы ў асобных раёнах, а днём пераважна па паўночна-заходняй частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень месцамі магчымы навальніцы, у многіх раёнах чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 8—14 цяпла. Удзень будзе ад плюс 15 да плюс 22 градусаў, а на поўдні — да 24 цяпла.

У пятніцу стане яшчэ халадней. Тады ўначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень у асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах месцамі навальніцы, пераважна па паўночнай частцы краіны чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 9—16 цяпла, удзень — ад плюс 12 да плюс 18 градусаў, па поўдні — да плюс 20 градусаў.

Згодна з доўгатэрміновым прагнозам айчынных спецыялістаў, у суботу надвор'е будзе вызначаць вобласць паніжанага атмасфернага ціску. Уначы будзе пераважна без ападкаў, днём у асобных раёнах, у асноўным па захадзе, пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 5—11 цяпла. Удзень прагназуецца ад плюс 14 да плюс 20 градусаў, па поўдні — да 22 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Захад-2017

# Вайскоўцы ўжо на пазіцыях

## Да сумеснага стратэгічнага вучэння ўзброеных сіл Беларусі і Расіі ўсё гатова

**Вучэнне яшчэ не пачалося, а вайскоўцы і іх тэхніка ўжо некалькі дзён на пазіцыях. Наколькі войскі і падраздзяленні гатовыя да выканання пастаўленых задач, даведаліся карэспандэнты «Звязды».**

Асноўная частка ўсёй артылерыі, якая будзе задзейнічана ў вучэнні, сканцэнтравана на палігоне пад Асіповічамі. Практычныя дзеянні яшчэ не пачаліся, але ваеннаслужачыя ўжо ў поўнай баявой гатоўнасці.

— Цяпер на палігоне завяршаецца падрыхтоўка да сумеснага стратэгічнага вучэння, — адзначыў **першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення баявой падрыхтоўкі Узброеных Сіл Беларусі палкоўнік Ігар КАВАЛЕНКА.** — Вайсковыя часці і падраздзяленні занялі раёны сканцэнтравання і ўдасканальваюць інжынернае абсталяванне ў пунктах кіравання абарончых пазіцый і рубяжоў.


Фота Надзеі БУЖАН.

У ходзе планавых мерапрыемстваў баявой падрыхтоўкі, тактыка-страявых заняткаў адпрацоўваюцца прыёмы і спосабы дзеянняў падчас бою ў адпаведнасці са сваім прызначэннем. Камандзіры ацэньваюць веды ваеннаслужачых, іх забеспячэнне, а таксама гатоўнасць да выканання задач падчас вучэння.

Як расказаў **камандзір узвода — старшы афіцэр 2-й гаўбічнай самаходнай артылерыйскай батарэі гвардыі старшы лейтэнант Аляксандр ЛЯПІЧ**, тэхніка знаходзіцца ў добрым стане, поўнасцю падрыхтавана да выканання пастаўленай баявой задачы. «У цяперашні момант асабовы склад адпрацоўвае заняцце агнявой пазіцыі, а таксама арыентаванне гармат і разлік каардынат і ўстановак для паражэння цэляў, займаецца падрыхтоўкай тэхнікі для здзяйснення стрэлу, — удакладняе камандзір узвода. — Для многіх з іх вучэнне — каласальны вопыт. Перш за ўсё гэта датычыцца ўзаемаадносін з ваеннаслужачымі нашай дружалюбнай дзяржавы».



Пакуль вайскоўцы адточваюць апошнія штрыхі перад выкананнем пастаўленых задач, у палявым лагеры для іх рыхтуецца вячэра. Увогуле, перад і падчас вучэння для ваеннаслужачых наладжана трохразовае харчаванне. Лагер на гэтыя некалькі дзён — яшчэ і месца адпачынку. Тут яны не толькі начуюць, а і, калі ёсць на гэта час, глядзяць тэлеперадачы, слухаюць радыё, чытаюць свежыя газеты. Ладзяцца для ўдзельнікаў вучэння і прагляд кінафільмаў, і спартыўныя спаборніцтвы, а нядаўна, на Дзень танкіста, да ваеннаслужачых увогуле завіталі артысты.

Для большасці вайскоўцаў, якія неўзабаве будуць удзельнічаць у манеўрах, вучэнне — вянец усёй службы. Для сяржанта рэзерву Радзівона Утробіна гэта і адзін з найбольш галоўных этапаў у жыцці. Як прызнаецца камандзір гарматы, для якога гэта апошні збор, вучэнне — гэта магчымасць даказаць афіцэрам, уласным сем'ям, а таксама ўсяму беларускаму народу, што на варце бяспекі нашай краіны стаяць прафесіяналы, неабыякавыя да лёсу Радзімы людзі.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*
*Асіповіцкі раён*

■ Фотафакт

# ПРАДМЕТЫ РУРЫКАВІЧАЎ

**Фонды Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея папоўніліся ўнікальнымі прадметамі IX стагоддзя.**




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Іх у падарунак музею перадаў пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расіі ў галіне культуры Валерый Казакоў. Старажытныя пярсцёнкі, падвеска, жэтон, якія цяпер будуць знаходзіцца ў Магілёве, папярэдне датуюцца IX стагоддзем, часамі Рурыкавічаў, але ўсе падрабязнасці яшчэ высветляць спецыялісты.

— Услед за доктарам гістарычных навук Ігарам Марзалюком, я лічу, што Магілёву, як і Мінску, больш як тысяча гадоў, — кажа Валерый КАЗАКОЎ.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

# Паляванне на Wi-Fi

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Калі казаць пра сталіцу, то сёрфінг у інтэрнэце на вакзале станцыі Мінск-Пасажырскі вельмі зручны. Перад падключэннем да пункта доступу BelRW_Wi-Fi неабходна прайсці аўтарызацыю. Вас папросяць увесці нумар свайго тэлефона і паставіць галачку ў графе, дзе вы прымаеце карыстальніцкае пагадненне. З яго, на мой погляд, дастаткова ведаць тое, што БЧ будзе збіраць вашыя персанальныя даныя і што вы згодныя перыядычна глядзець рэкламу, якую вам будуць дасылаць. У прынцыпе, усё стандартна. Далей вам прыходзіць СМС з кодам, які вы і ўводзіце для аўтарызацыі. Пасля прагляду рэкламы, на якую вы траціце некалькі секундаў, вы пераходзіце да карыстання інтэрнэтам. Адначасова можна знаходзіцца ў сеціве з некалькіх прылад — планшэт, камп'ютар — і пры гэтым уводзіць толькі адзін нумар тэлефона. Прагляд відэа і праслухоўванне музыкі не выклікаюць цяжкасцяў. Самая вялікая хуткасць запампоўкі файла ў 100 Мб зафіксавана мной на адзнаце 9,1 Мб/с. Магчыма, калі карыстальнікаў стане больш — усё зменіцца не ў лепшы бок, але пакуль усё добра.



Фота БЕЛТА.

## НЕ БЕЗ ПРАБЛЕМ

Аднак нельга проста так узяць і зрабіць усё гладка ды яшчэ і з першага разу, праўда? Давайце ўспомнім, што БЧ анансавала бясплатны Wi-Fi не толькі на вакзалах абласных гарадоў, але і на станцыях у Баранавічах, Бабруйску, Барысаве, Жлобіне, Калінкавічах, Крычаве, Лідзе, Лунінцы, Маладзечне, Оршы, Асіповічах, Полацку і Пінску.

Дзеля цікавасці паспрабаваў пасёрфіць у сетцы ў Оршы. Здзіўлены я не быў — трапіць у інтэрнэт з залы чакання або ў любым іншым пункце аршанскага чыгуначнага вакзала ў мяне не атрымалася. Пасля размоў з персаналам я даведаўся, што доступ у сетку ёсць толькі ў платных месцах — зале адпачынку і VIP-зале вакзала. На этапе выпрабавання Wi-Fi па ўсім будынку да сеткі не маглі падключыцца нават супрацоўнікі вакзала. Выходзіць, тут схема пакуль такая: хочаш інтэрнэт — плаці за атмасферу. Я, вядома, не змог фізічна аб'ехаць усе вакзалы ў рэгіёнах, каб даведацца, як і што там працуе. Магчыма, такая праблема ёсць толькі на аршанскай станцыі, але яе наяўнасць пакуль застаецца фактам.

А можа, гэта зусім не праблема, а хутчэй бізнес-мадэль? На мой погляд, дзе такая мадэль патрэбна — дык гэта сапраўды на шляху з Мінска да Оршы. Вось ты спрабуеш пагаварыць з кімсьці праз месенджар, але званкі нярэдка абрываюцца, а потым сядзі і чакай наступнага населенага пункта, дзе сетка працуе. Ды добра інтэрнэт — месцамі і радыё нават не зловіш. Што перашкаджае БЧ зрабіць на гэтым маршруце тое ж самае, што і на шляху з Мінска ў Гомель? Там Wi-Fi хоць і нестабільны, але ўсё ж раздаецца «Штадлерам».

## АБУРЭННЯ ПОСТ

У тэме пра бясплатны Wi-Fi на вакзалах хацелася б адысці ад вакзалаў таму, што набалела. Гарадам таксама патрэбен паўсюдны Wi-Fi, і хай ён будзе нават платным. Вось прыязджае іншаземец без роўмінгу (бо некаторыя прывыклі, што сетка паўсюль даступная без праблем), а тут у Мінску (або цэнтры Еўропы, калі хочаце) нават немагчыма толкам скарыстацца інтэрнэтам. Ратуюцца альбо хот-спотамі ад шэрагу правайдараў (якія знайсці можна, але з цяжкасцю), альбо бясплатным Wi-Fi у кафэ, але пры ўмове, што звычайна ў такіх месцах шумна — міжнародны званок зробіш з цяжкасцю.

Не менш надзённая праблема — адсутнасць Wi-Fi у метро. Першае, што прыходзіць у галаву, — вінаваціць ва ўсім метрапалітэн. Але на самай справе тут не ўсё так проста. Гадоў 10 таму кампанія «Белтэлекам» разглядала магчымасць устаноўкі абсталявання для забеспячэння бесправаднога доступу ў сетку з метро. Але не склалася. Адна з апошніх спроб у гэтым кірунку была зроблена крыху больш за год таму. Але выйшла як у анекдоце: сабраліся тры мабільныя аператары і вырашылі запусціць партнёрскі праект сувязі паміж станцыямі метро «Пятроўшчына» і «Малінаўка» з магчымасцю доступу да высакахуткаснага інтэрнэту... А далей зусім не смешна — ні сувязі, ні інтэрнэту. Як растлумачылі ў прэс-службе Мінскага метрапалітэна, сёння аператары не могуць дамовіцца паміж сабой, хто з іх будзе рэалізоўваць праекты па забеспячэнні доступу ў сетку ў нашай падземцы. Не могуць вызначыцца і з абсталяваннем. А гэта азначае, што заглыбіцца ў лічбавую прастору пад зямлёй, як гэта робяць у Токіа, Лондане або Маскве, мы зможам... невядома калі?..

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*


БЕЛАРУСБАНК

**ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует вкладчиков об изменении процентных ставок по срочным банковским вкладам в белорусских рублях**

С 13.10.2017 г. устанавливаются по ранее открытым срочным банковским вкладам в белорусских рублях:

– **«Премиально — накопительный «Детский»**, открытым до 13.11.2015 г., ставка основных процентов в размере 8% годовых;

– **Накопительный** (накопительный вклад в национальной валюте с ежемесячной капитализацией; накопительный вклад в белорусских рублях; срочный банковский накопительный вклад в белорусских рублях, а также накопительные вклады, введенные согласно Приказу Государственного банка СССР от 29.03.1990 №30 «О введении новых видов вкладов в учреждениях Сберегательного банка СССР»), процентная ставка в размере 8% годовых.

*Установленный размер процентов применяется только к вышеуказанным срочным банковским вкладам, по которым не нарушена срочность, и автоматическое перезаключение которых на новый срок произошло до 01.04.2016 г.*

С 13.10.2017 г. устанавливается по действующим срочным банковским вкладам в белорусских рублях **«Интернет — депозит — Тренд»** со сроком хранения 36 месяцев, открытым до 05.05.2015 г., ставка основных процентов при фактическом ежедневном остатке вклада:

до 2000,00 рублей (включительно) — в размере 7,9% годовых;
свыше 2000,00 рублей — в размере 8,4% годовых.

*Установленный размер процентов применяется к срочным банковским вкладам, по которым не нарушена срочность.*

С 13.10.2017 г. устанавливаются по действующим срочным банковским вкладам в белорусских рублях, открытым до 13.09.2017 г., процентные ставки в следующих размерах:

– **«Классик Отзывный до года»:**
на срок 185 дней — 2,5% годовых;
– **«Классик Безотзывный до года»**:
на срок 6 месяцев — 5,2% годовых;
на срок 9 месяцев —6,9% годовых;
на срок 9 месяцев (в рамках клуба «Бархат») — 7,9% годовых;
– **«Свободный выбор»**:
на срок 11 месяцев — 9% годовых;
на срок 24 месяца — 10,5% годовых.
– **«Классик Безотзывный свыше года»**:
на срок 18 месяцев — 9,7% годовых;
на срок 24 месяца — 10,2% годовых.
– **«Интернет—депозит—Тренд Отзывный»**:
на срок 3 месяца — 3% годовых;
на срок 6 месяцев — 5% годовых;
на срок 9 месяцев — 6% годовых.
– **«Интернет—депозит—Тренд Безотзывный»**:
на срок 3 месяца — 5% годовых;
на срок 6 месяцев — 6% годовых;
на срок 9 месяцев — 7,5% годовых;
на срок 9 месяцев (в рамках Клуба «Карт—бланш») — 8% годовых;
на срок 9 месяцев (в рамках Клуба #настарт) — 8% годовых.
– **«Классик Почтовый Отзывный»** — 5,5% годовых.
– **«Классик Почтовый Безотзывный»** — 7,5% годовых.

*Установленный размер процентов применяется к вышеуказанным срочным банковским вкладам, по которым не нарушена срочность.*

**Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»**

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности №1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

**Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов)**


■ Тэхналогіі для жыцця

# ГОРАД-ЭКАКЛАСТАР: УТОПІЯ ЦІ МАГЧЫМАСЦЬ?

## Як забяспечыць рэальнае жыццё віртуальнымі сродкамі

**Збудаваць рэальныя дамы за віртуальныя грошы ў Беларусі пакуль не ўдавалася ніводнаму бізнесмену. Ажыццявіць такую ідэю — стварыць у рэспубліцы пасяленне аднадумцаў-уласнікаў, якія будуць жыць у «разумных» экалагічных дамах, спрабуе прадпрымальнік-энтузіяст Аляксандр Міцін. Рэалізаваць свой праект ён мяркуе за кошт токенаў — электронных жэтонаў, якія замяняюць сапраўдныя фінансы і даюць права на ўваход у суполку, аднак набываюцца яны за сапраўдныя грошы... Спатрэбіцца на гэта першапачаткова ні многа ні мала — $1,8 млн, і энтузіяст ведае, дзе іх узяць — на платформе ICO.**

### Токен — пропуск у суполку і сродак заробку

ICO (Initial Coin Offering — «першаснае размяшчэнне токенаў») — новы спосаб прыцягнення інвестыцый праз інтэрнэт. Эксперты, дарэчы, прадракаюць яму вялікую будучыню. Колькасць інвестараў, якія хочуць зарабіць на гэтым, імкліва расце — кажуць, такіх у свеце ўжо больш за 10 млн чалавек, а ў ICO прыцягнута каля $5,5 млрд.

Сродкі для будаўніцтва горада-экакластара (так называе свой праект аўтар) з уласнай эканамічнай мадэллю развіцця, абароненай ад крызісаў, і пенсіяй для яго жыхароў, якая залежыць ад здольнасцяў і ступені ўкладу ў развіццё жыцця ў суполцы, Аляксандр мяркуе сабраць менавіта на інтэрнэт-платформе ICO.

— Кожны ахвотны можа набыць токен (іх выпускаюць арганізатары ICO), які стане паем (укладам) чалавека ў нашу суполку сумеснага ўладання і адначасова пропускам, што дасць права стаць членам суполкі, прынцыпы развіцця якой заснаваны на роўнасці, — сцвярджае ён. — Структура нашага таварыства будзе мець форму сотаў-ячэек, і кожны чалавек сам вырашае, чым зоймецца ў структуры. У тым ліку, ці будзе ён жыць непасрэдна ў доме і працаваць у суполцы або знаходзіцца ўбаку, можа і ў іншай краіне, і атрымліваць з жыццядзейнасці структуры прыбытак адпаведна сваім укладанням.

Перш за ўсё ён плануе сабраць грошы з людзей, якія зацікавіліся яго ідэяй і вырашылі фінансава падтрымаць яе рэалізацыю. Гэтыя сродкі паслужаць для стварэння інструментаў суполкі і першаснай капіталізацыі. Аляксандр, прыхільнік натуральнага і экалагічнага, мяркуе, што дамы, «начыненыя» сучаснымі інтэрнэт-тэхналогіямі, будуць драўлянымі.

Другім крокам ён распрацуе статут сумеснага валодання і першасныя задачы суполкі, якія дадуць ёй магчымасць развівацца.

— Статут павінны быць зразумелы ўсім членам, кожны будзе ведаць, што ён атрымае з удзелу ў нашым уладанні. Галоўнае, што я абяцаю ў сваім экакластары, — нармальнае жыццё, — запэўнівае Аляксандр. — Кожны член нашай суполкі пры набыцці токена персаналізуецца. Яны змогуць праз свае інтэрнэт-кабінеты адсочваць, што будуецца, як і на якой увогуле стадыі знаходзіцца рэалізацыя праекта. Прыбытак укладчыкі пачнуць атрымліваць пасля пачатку эксплуатацыі дамоў.

### Інвестыцыі збоку ці «праца на зямлі»

Каб патанніць развіццё экакластара, прадпрымальнік мяркуе ўключаць у склад суполкі вытворчасці. Напрыклад, набыць за невялікі кошт існуючы дрэваапрацоўчы цэх, які знаходзіцца на мяжы выжывання, аднак мае неабходнае абсталяванне. З дапамогай грошай яму дадуць новае жыццё, а суполка праз гэта атрымае больш танныя матэрыялы для будаўніцтва дамоў. Такім чынам з працэсу выключаюцца пасрэднікі, што таксама станоўча адаб'ецца на развіцці фінансавага жыцця сумеснага ўладання.

Кожны сябра суполкі можа адлічваць працэнт ад свайго прыбытку ў так званы пенсійны фонд.

— А пры нараджэнні ў нашым сумесным уладанні дзіцяці на яго рахунак налічваюцца сродкі ў крыптавалюце — віртуальныя фінансавыя адзінкі, якія будуць выпушчаны ICO. Людзі могуць траціць іх, напрыклад, на адзенне малому, дзіцячы садок, школу, і гэтая сума будзе павялічвацца за кошт развіцця суполкі.



Пры гэтым ён заклікае стаць членамі ўладання і дзяржаву, і інвестараў з розных краін, і саміх жыхароў экакластара. Бізнесмен не выключае, што калі яго ідэя рэалізуецца ў Беларусі, падобныя экакластары пачнуць ствараць і па-за межамі нашай краіны.

На пытанне, як будзе з'яўляцца прыбытак ад функцыянавання суполкі і чаму інвестары павінны зацікавіцца прапановай Аляксандра і ўкласці рэальныя грошы ў віртуальную пляцоўку, ён адказвае так:

— Пытанне не ў прыбытку, а ў даходах людзей. Кожны член суполкі мае права прадставіць на разгляд інвестараў таварыства свой праект, так званы стартап. Тыя, каму ён спадабаецца, пагаджаюцца на фінансаванне канкрэтна гэтай ідэі, сочаць за яе развіццём і атрымліваюць ад яе прыбытак, — удакладняе Аляксандр. — З іншага боку, члены нашага экакластара могуць проста «працаваць на зямлі». Напрыклад, вырошчваць курэй-нясушак. За грошы суполкі яму будуецца птушнік, даецца корм. Ён у сваю чаргу пастаўляе суполцы яйкі і атрымоўвае нейкі працэнт ад сумы прыбытку за іх. Усе гэтыя працэсы — ініцыятыўныя праекты або гадаванне птушак — будуць відаць у ICO, і размеркаванне даходаў будзе шчырым і дастойным.

Аляксандр агучыў ідэю свайго праекта па стварэнні горада-экакластара на прэзентацыі беларускай ICO-платформы — ICO HUB, якая, як мяркуецца, будзе мець цалкам айчынныя карані, чаго ў краіне яшчэ не здаралася. Ініцыятар яе стварэння — Улад Аўсяннікаў, вопытны IT-спецыяліст. Прыцягнуць інвестыцыі пад свой «зямны» праект, як кажа сам Аляксандр, і расказаць пра яго як мага большай колькасці людзей прасцей за ўсё менавіта такім чынам. Літаральна за тыдзень яму напісала ўжо некалькі чалавек, гатовых прэзентаваць свае праекты на пляцоўцы ICO HUB. Пакуль пляцоўка рыхтуецца да запуску.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by* ■

## ОБЪЯВЛЕНИЕ

ОАО «Минскоблхлебопродукт» извещает, что **26 сентября 2017 года** состоится внеочередное собрание акционеров по адресу: г. Борисов, ул. Заводская, 4. Начало собрания: 14.00. Регистрация акционеров с 13.00. При себе иметь документы: акционеру общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

**Повестка дня:**

О реорганизации ОАО «Минскоблхлебопродукт» путем присоединения к нему ОАО «Борки Агро» и утверждение передаточного акта.

Утверждение размера уставного фонда ОАО «Минскоблхлебопродукт».

О внесении изменений и дополнений в устав ОАО«Минскоблхлебопродукт».

О дополнительном выпуске акций ОАО «Минскоблхлебопродукт», утверждение решения о выпуске акций.

О создании сельскохозяйственного унитарного предприятия «Борки Агро».

О внесении изменений и дополнений в Положение о порядке купли-продажи жилых домов (квартир), находящихся в собственности ОАО «Минскоблхлебопродукт».

Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт»

Тел. 220-59-17

УНП 600013173

белагропромбанк
традиции будущего

ОАО «Белагропромбанк» сообщает, что в связи с уменьшением с 13.09.2017 ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь на 0,5 процентных пункта до 11,5 процентов годовых, **с 14.10.2017** ОАО «Белагропромбанк» уменьшает на 0,5 процентных пункта плавающие процентные ставки по договорам банковского вклада «Универсальный» и «Сберегательный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006. Также, в соответствии с условиями договора пролонгации вклада «Стабильный» осуществляется на условиях применения процентной ставки для данного вида вклада (депозита), действующей на день продления договора.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности №2 13.01.2017
выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551

## Уведомление страхователей ОАСО «Пенсионные гарантии»

В связи с прекращением действия выданного ОАСО «Пенсионные гарантии» специального разрешения (лицензии) на право осуществления страховой деятельности обязательства, принятые ОАСО «Пенсионные гарантии» по договорам добровольного страхования, подлежат передаче в РДУСП «Стравита».

Передающая страховая организация — открытое акционерное страховое общество "Пенсионные гарантии" (ОАСО "Пенсионные гарантии») — юридический адрес: 220013, г. Минск, ул. Я. Коласа, 38/16, к. 3, адрес для приема посетителей: г. Минск, ул. Скрыганова, 6, корп. 2, оф. 2304, адрес для корреспонденции: 220079, г. Минск, а/я 267; тел./факс 8 (017) 204-50-03.

Принимающая страховая организация — Республиканское дочернее унитарное страховое предприятие «Стравита» (РДУСП «Стравита»); 220037, г. Минск, пер. Козлова, 7; тел./факс 8-017-245-16-99; info@stravita.by; www.stravita.by.

Договоры добровольного страхования жизни и соответствующие обязательства передаются по состоянию на 31.10.2017 года.

Все процедуры по передаче обязательств должны быть завершены и акт приема передачи подписан не позднее четырех месяцев со дня заключения передающей страховой организацией и принимающей страховой организацией договора о передачи обязательств.

Договор о передаче обязательств от 04.09.2017 № 04-09/17.

УНП 191027557

**ЗАВЕРЕНО**
Департаментом по ценным бумагам
Министерства финансов
Республики Беларусь
07.09.2017 г.
Лихачевский В. В.

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## ОБ ЭМИССИИ ОБЛИГАЦИЙ ЧЕТВЕРТОГО ВЫПУСКА

## Закрытого акционерного общества «Универсам «Центральный»

**1. Полное и сокращенное наименование эмитента: на белорусском языке: полное — Закрытае акцыянернае таварыства «Універсам «Цэнтральны»; сокращенное — ЗАТ «Універсам «Цэнтральны»;**

на русском языке: полное — Закрытое акционерное общество «Универсам «Центральный» (далее — эмитент); сокращенное — ЗАО «Универсам «Центральный».

**2. Местонахождение эмитента: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, проспект Независимости, дом 23; телефон: (8017) 226-19-25; факс: (8017) 327-61-95; электронный адрес: info@centralny.by; официальный интернет-сайт: www.centralny.by.**

**3. Эмитент зарегистрирован Минским городским исполнительным комитетом 14 апреля 1992 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №100060965.**

**4. Уставный фонд эмитента составляет 12 000 белорусских рублей.**

**5. Основные виды деятельности эмитента: розничная торговля в неспециализированных магазинах преимущественно продуктами питания, напитками и табачными изделиями.**

**6. Депозитарием эмитента является депозитарий Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк», зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 27 октября 1995 года, номер государственной регистрации — 056, код депозитария — 005, расположенный по адресу: Республика Беларусь, 220089, г. Минск, пр-т Дзержинского, 18. Специальное разрешение (лицензия) №02200/5200-1246-1089, выданное Министерством финансов Республики Беларусь на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам сроком действия — бессрочно.**

7. Эмитент в соответствии с законодательством Республики Беларусь раскрывает информацию на рынке ценных бумаг путем: размещения на едином информационном ресурсе рынка ценных бумаг (далее — единый информационный ресурс); публикации в печатных средствах массовой информации (в газете «Звязда») и (или) размещения на официальном интернет-сайте эмитента, указанном в пункте 2 настоящего документа; и (или) доводит до сведения неопределенного круга лиц иным образом, определенным республиканским органом государственного управления, осуществляющим государственное регулирование рынка ценных бумаг (далее — регистрирующий орган).

Информация об изменениях и/или дополнениях, внесенных в Проспект эмиссии облигаций четвертого выпуска эмитента (далее — Проспект эмиссии), размещается эмитентом на едином информационном ресурсе, а также публикуется в газете «Звязда» не позднее 7 дней после их регистрации в регистрирующем органе.

Эмитент в соответствии с законодательством Республики Беларусь раскрывает годовой отчет в срок не позднее одного месяца после его утверждения в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь о хозяйственных обществах, путем размещения на едином информационном ресурсе, а также путем опубликования в газете «Звязда» либо размещения на официальном интернет-сайте эмитента. Информация, размещенная на официальном интернет-сайте эмитента, должна быть доступна для обозрения всем заинтересованным лицам на постоянной основе до погашения облигаций настоящего выпуска.

Эмитент раскрывает информацию о своей реорганизации или ликвидации, а также о реорганизации дочерних и зависимых хозяйственных обществ эмитента (при их наличии), в соответствии с законодательством Республики Беларусь, в том числе путем ее размещения на едином информационном ресурсе не позднее двух рабочих дней:

в случае ликвидации — с даты принятия соответствующего решения общим собранием акционеров эмитента;

в случае реорганизации — с даты принятия соответствующего решения общим собранием акционеров эмитента, а также с даты государственной регистрации организации, созданной в результате реорганизации; с даты внесения в единый государственный регистр юридических лиц и индивидуальных предпринимателей записи о прекращении деятельности присоединенной организации.

Кроме того, в случае принятия эмитентом решения о ликвидации (прекращении деятельности), сведения о том, что эмитент находится в процессе ликвидации (прекращения деятельности), подлежат размещению в глобальной компьютерной сети Интернет на официальном сайте юридического научно-практического журнала «Юстиция Беларуси» (www.justbel.info) в порядке и сроки, определенные законодательством Республики Беларусь.

Эмитент раскрывает информацию о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) в соответствии с законодательством Республики Беларусь путем:

ее размещения на едином информационном ресурсе не позднее двух рабочих дней с даты получения эмитентом копии заявления в экономический суд о банкротстве эмитента;

публикации в журнале «Судебный вестник Плюс: Экономическое правосудие» в течение 5 календарных дней с момента получения соответствующего судебного постановления.

Эмитент раскрывает информацию о результатах финансово-хозяйственной деятельности, информацию о существенных фактах (событиях, действиях), касающихся его финансово-хозяйственной деятельности, которые могут повлиять на стоимость облигаций настоящего выпуска, в порядке и сроки, установленные законодательством Республики Беларусь.

В период всего срока обращения облигаций настоящего выпуска эмитент несет ответственность по возмещению их владельцам убытков, причиненных недостоверной и (или) неполной информацией об облигациях настоящего выпуска.

**8. Наблюдательный совет эмитента принял решение о четвертом выпуске облигаций 8 августа 2017 г., протокол №7.**

**9. Облигации четвертого выпуска эмитента — именные процентные конвертируемые эмиссионные ценные бумаги в бездокументарной форме, имеющие равную номинальную стоимость и сроки осуществления прав в рамках настоящего выпуска вне зависимости от времени приобретения облигации (далее совокупно именуемые — облигации).**

Объем выпуска облигаций — 2 000 000 (два миллиона) долларов США.

Количество облигаций — 2 000 штук.

Номинальная стоимость облигации — 1 000 (одна тысяча) долларов США.

**10. Эмитент осуществляет эмиссию облигаций в соответствии с подпунктом 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 г. №277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг». Исполнение обязательств эмитента по облигациям обеспечивается поручительством на сумму 2 000 000 долларов США.**

Поручителем выступает Общество с дополнительной ответственностью «НП-Сервис» (220056, г. Минск, ул. Героев 120-й дивизии, 15-81, УНП 100080849). Договор о предоставлении поручительства от 17 августа 2017 г. № 1.

**11. Размещение облигаций осуществляется:**

после опубликования в газете «Звязда» и размещения на едином информационном ресурсе настоящего документа, заверенного в установленном порядке регистрирующим органом;

путем проведения открытой продажи облигаций юридическим лицам (включая банки) и (или) физическим лицам, резидентам и (или) нерезидентам Республики Беларусь (далее — покупатели облигаций).

Дата начала размещения облигаций: 1 сентября 2017 г.

Дата окончания размещения облигаций: 25 августа 2027 г.

Открытая продажа облигаций осуществляется на организованном рынке в торговой системе открытого акционерного общества «Белорусская валютно-фондовая биржа» (далее — организатор торговли) в соответствии с законодательством Республики Беларусь и локальными нормативными правовыми актами организатора торговли.

Время проведения открытой продажи облигаций — в соответствии с регламентом торгов организатора торговли.

Для покупки облигаций покупатели могут обратиться в Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее — уполномоченный брокер в его точке обслуживания. Перечень точек обслуживания и их режим работы размещен на официальном интернет-сайте уполномоченного брокера (http://belarusbank.by), а также на официальном интернет-сайте эмитента: www.centralny.by.

Денежные средства, поступающие при размещении облигаций, будут зачисляться в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь в безналичном порядке на текущий (расчетный) счет в долларах США BY71OLMP30120000881570000840 в Совместном белорусско-российском открытом акционерном обществе «Белгазпромбанк», г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2, БИК OLMPBY2X.

**12. Срок обращения облигаций — 3651 календарный день (с 1 сентября 2017 г. по 31 августа 2027 г.)**

**13. Дата начала погашения облигаций — 31 августа 2027 г.**

Для целей погашения облигаций депозитарий эмитента формирует реестр владельцев облигаций на 27 августа 2027 г. В случае если указанная дата выпадает на нерабочий день, фактическое формирование реестра осуществляется в последний рабочий день, предшествующий нерабочему дню.

**14. По облигациям установлен постоянный процентный доход (далее — доход), выплачиваемый периодически (один раз в шесть месяцев) в течение срока обращения облигаций по ставке в виде фиксированного процента к номинальной стоимости облигации в размере 6,5 (шесть целых пять десятых) процента годовых.**

По поручению эмитента выплату дохода, выплату денежных средств при досрочном погашении и погашении облигаций осуществляет депозитарий эмитента.

Сумма дохода перечисляется владельцам облигаций в безналичном порядке в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь. В случае выплаты дохода в белорусских рублях, выплата осуществляется по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату выплаты дохода.

**15. Эмитент осуществляет досрочное погашение облигаций при невозможности замены обеспечения исполнения обязательств по облигациям либо невозможности предоставления дополнительного обеспечения в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь о ценных бумагах.**

Кроме того эмитент вправе по собственной инициативе принять решение о досрочном погашении облигаций настоящего выпуска либо его части.

В случае досрочного погашения части выпуска облигаций досрочное погашение осуществляется каждому владельцу облигаций пропорционально количеству принадлежащих ему облигаций. Расчет количества досрочно погашаемых облигаций осуществляется с округлением до целого числа в соответствии с правилами математического округления.

Причитающаяся к выплате сумма денежных средств за досрочно погашаемые Облигации перечисляется в безналичном порядке в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь на счета владельцев облигаций, открытые в уполномоченных банках Республики Беларусь. В случае досрочного погашения облигаций в белорусских рублях, досрочное погашение осуществляется по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату досрочного погашения облигаций.

**16. Порядок погашения облигаций**

При погашении облигаций владельцам облигаций выплачивается номинальная стоимость облигаций, а также доход за последний период начисления дохода (иной неполученный доход — при наличии).

Погашение облигаций осуществляется в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием эмитента на дату, установленную в пункте 13 настоящего документа, путем перечисления в безналичном порядке причитающейся суммы в соответствии с валютным законодательством Республики Беларусь. В случае погашения облигаций в белорусских рублях, погашение осуществляется по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь, установленному на дату начала погашения облигаций.

**17. В период обращения облигаций эмитент осуществляет приобретение облигаций до даты начала погашения облигаций с возможностью последующего обращения облигаций (далее — досрочный выкуп облигаций) на организованном рынке в соответствии с законодательством Республики Беларусь и правилами, определяемыми организатором торговли.**

Досрочный выкуп облигаций осуществляется по цене, равной текущей стоимости облигации в валюте номинала облигации (доллары США), за исключением дат выплаты дохода, в которые облигации досрочно выкупаются по номинальной стоимости облигации.

Эмитент обязуется осуществлять досрочный выкуп облигаций в следующие даты: 26.08.2019, 25.08.2021, 25.08.2023, 26.08.2025, 25.08.2027. Владельцы облигаций вправе требовать досрочного выкупа облигаций только в указанные даты при соблюдении процедуры, определенной Проспектом эмиссии.

Кроме того, эмитент обязуется осуществить досрочный выкуп облигаций также в случае несогласия владельца облигаций с решением эмитента о замене обеспечения исполнения обязательств эмитента по облигациям.

**18. В случае запрещения эмиссии облигаций, признания регистрирующим органом настоящего выпуска облигаций недействительным, эмитент возвращает владельцам облигаций средства, полученные в оплату размещенных облигаций, а также накопленный по этим облигациям доход в месячный срок с даты признания выпуска недействительным, и письменно уведомляет регистрирующий орган о возврате указанных средств владельцам облигаций в полном объеме.**

**19. Ознакомиться с Проспектом эмиссии (изменениями в Проспект эмиссии — при наличии) можно в точках обслуживания уполномоченного брокера. Перечень точек обслуживания и их режим работы указаны в пункте 11 настоящего документа.**

Директор
Закрытого акционерного общества
«Универсам «Центральный» А. А. Застенский

Директор общества с ограниченной
ответственностью «Эккаунт Проф» Т. Г. Бойкова

## Извещение о проведении 25 сентября 2017 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскремстрой»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (состав и сведения о продаваемом имуществе)** | Двухэтажное кирпичное здание административно-бытового корпуса общей площадью 634,4 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-457; одноэтажное кирпичное здание хозяйственного склада общей площадью 84,8 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-311; одноэтажный дом из гипсолита общей площадью 27,9 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-308; одноэтажное кирпичное здание столярного цеха общей площадью 1983,8 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-458; одноэтажный железобетонный цех лесопиления общей площадью 915,9 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-314; навес для сушки пиломатериалов общей площадью 229,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-592; одноэтажный склад — ангар из металлического профиля общей площадью 333,3 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-309; одноэтажное кирпичное здание гаража общей площадью 205,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-310; двухэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции общей площадью 47,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-638; одноэтажная кирпичная сушильная камера общей площадью 64,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-589; одноэтажное кирпичное здание склада общей площадью 255,6 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-456; одноэтажное кирпичное здание мебельного цеха общей площадью 367,3 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 632/С-313;<br>навес столярного цеха (инв. №113018); покрытие асфальтобетонное (инв. №113013); теплогенератор (инв. №4013); забор железобетонный (инв. №113012); ворота (3 шт.); эстакада для хранения леса (инв. №113015); наружные электросети (инв. № 31358); кран подвесной ПТ 4363 (2 шт.) (инв. №№ 413152, 413153); камера КСО и шинный мост (инв. №413131); конденсаторная установка ФЕБ (инв. №413245); аспирационная система АС-3 (инв. №413266); сети водопроводные чугунные (инв. № 308); сеть канализационная (инв. №309); пожарный резервуар (2 шт.) (инв. №№113014, 113101); нагреватель Булеран (инв. №6132171); шкаф СН1-3Р (инв. №413120); шкафы СИЛ. ШРС (2 шт.) (инв. №№413125, 413126) |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | Минская область, Воложинский район, Раковский с/с, аг. Раков, ул. 17 сентября, 17 |
| **Сведения о земельном участке** | кадастровый номер — 622085700062000019, площадь — 1,7569 га, целевое назначение — земельный участок для обслуживания зданий и сооружений завода |
| **Продавец имущества** | ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220030, г. Минск |
| **Организатор торгов** | государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск |
| **Начальная цена предмета торгов с учетом НДС** | 955 753,29 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 95 000,00 бел. руб. |
| **Условие торгов** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие с организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **25 сентября 2017 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 13.09.2017 по 21.09.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам — до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 226-41-14, (017) 200-04-11, (029) 688-61-94 (ОАО «Минскремстрой»)

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя № 9 (25)

Тэма нумара

# КУДЫ ПРЫВЯДЗЕ ШЛЯХ Е-40?

## Аднаўленне старажытнага воднага маршруту патрабуе пільнай увагі прыродаахоўных структур


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Дакумент «Аднаўленне магістральнага воднага шляху Е-40 на ўчастку Днепр—Вісла: ад стратэгіі да планавання» выклікаў шмат пытанняў, у тым ліку экалагічных, як у спецыялістаў, так і ў грамадскасці. З чым гэта звязана, мы і паспрабавалі разабрацца.**

### МАРШРУТ З ГІСТОРЫЯЙ

Е-40 — водны шлях даўжынёй больш за 2 тысячы км, які праходзіць па тэрыторыі Польшчы, Беларусі і Украіны і злучае Балтыйскае і Чорнае моры праз Гданьск — Варшаву — Брэст — Пінск — Мазыр — Кіеў — Херсон.

Гісторыя стварэння гэтай воднай трасы пачынаецца ў другой палове XVII стагоддзя, калі ў 1655 годзе на сейме Рэчы Паспалітай была ўпершыню агучана ідэя будаўніцтва суднаходнага канала, які б злучаў басейны Прыпяці і Буга. Але першыя грузы па новым водным шляху, у склад якога ўвайшоў і размешчаны на тэрыторыі Беларусі Дняпроўска-Бугскі канал, пайшлі толькі ў 1784 годзе. З цягам часу гэты водны шлях перастаў эксплуатавацца, і сёння ён суднаходны толькі на некаторых участках.

Некалькі гадоў таму пра аднаўленне старажытнага шляху загаварылі зацікаўленыя бакі ва ўсіх краінах-суседках. Так, партнёрамі праекта «Аднаўленне магістральнага воднага шляху Е-40 на ўчастку Днепр—Вісла: ад стратэгіі да планавання» выступаюць арганізацыі з Беларусі, Польшчы і Украіны. Сярод іх — Адміністрацыя маршалка Люблінскага ваяводства (Польшча), Таварыства рэгіянальнага і мясцовага развіцця «Прагрэс» (Польшча), Валынскае абласное ўпраўленне водных рэсурсаў (Украіна), ГА «Валынская асацыяцыя вучоных і інаватараў» (Украіна). Удзельнікамі з беларускага боку з'яўляюцца РУЭБП «Днепра-Бугскі водны шлях» (вядучы партнёр праекта), Брэсцкі аблвыканкам і мясцовы фонд садзейнічання развіццю міжнароднага дыялогу і супрацоўніцтва «Інтэракцыя».

Агульны бюджэт праекта — 912 657 еўра, з іх 821 281 еўра складае суфінансаванне ЕС, а 91 376 еўра — уклад партнёраў.

На тэрыторыі нашай краіны ў праект уключаны Дняпроўска-Бугскі канал, рэкі Мухавец (басейн Балтыйскага мора), Піна і Прыпяць (басейн Чорнага мора). Аднаўленне воднага шляху Е-40 прадугледжвае ўзвядзенне гідратэхнічных збудаванняў на Прыпяці і Дняпроўска-Бугскім канале, павелічэнне габарытаў фарватару і многае іншае.

У 2015 годзе была створана трансгранічная камісія па пытаннях развіцця водна-транспартнага злучэння Е-40. У камісіі сумесна працуюць прадстаўнікі абласных улад, міністэрстваў, навукова-даследчых інстытутаў, транспартных і лагістычных прадпрыемстваў і прыродаахоўных арганізацый Беларусі, Польшчы і Украіны.

**Андрэй РЭКЕШ, сакратар камісіі па пытаннях развіцця водна-транспартнага злучэння Е-40 на ўчастку Днепр—Вісла**, сцвярджае, што праект перспектыўны ў многіх аспектах:

— Праходзячы адразу праз тры краіны, водны маршрут Е-40 можа стаць і асновай для развіцця новага турыстычнага прадукту ў рэгіёне — трансгранічных рачных круізаў. Турысты змогуць наведаць найпрыгажэйшыя гарады (Гданьск, Варшаву і Кіеў), агледзець пушчы беларуска-польскага памежжа. Яшчэ адным перспектыўным кірункам можа стаць рыбалоўны турызм. Больш за тое, пры належным развіцці інфраструктуры пляжы рэк, па якіх будзе пралягаць водны шлях Е-40, змогуць скласці канкурэнцыю марскім курортам.

Эксперт лічыць, што аднаўленне водна-транспартнага злучэння Е-40 дазволіць перавозіць да 4 млн тон грузаў штогод. З дапамогай гэтай транспартнай артэрыі будуць інтэнсіўна развівацца эканамічныя адносіны паміж Польшчай, Беларуссю і Украінай. А дзякуючы марскім партам Гданьска і Адэсы, тавары, якія будуць перавозіцца па водным шляху Е-40, могуць дастаўляцца ў любую кропку свету.

Акрамя таго, па словах Андрэя Рэкеша, рачны транспарт значна пераўзыходзіць «сухапутныя» альтэрнатывы вялікімі аб'ёмамі грузаперавозак. Так, баржа-пляцоўка грузападымальнасцю 900 тон замяняе 18 вагонаў па 50 тон або 45 грузавых аўтамабіляў-дваццацітоннікаў. Пры гэтым баржы могуць пераадольваць сотні кіламетраў па цячэнні ракі без гаручага.

### ПРЫРОДА — У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

Але ці не нашкодзіць рэалізацыя гэтага праекта каштоўным прыродным тэрыторыям Беларусі? Уздоўж воднага шляху ў межах краіны размешчаны Нацыянальны парк «Прыпяцкі», Палескі радыяцыйна-экалагічны запаведнік, а таксама 11 заказнікаў рэспубліканскага значэння і 6 — мясцовага. 12 з гэтых аб'ектаў маюць міжнароднае значэнне — яны ахоўваюцца Рамсарскай канвенцыяй і з'яўляюцца тэрыторыямі, важнымі для птушак.

Па словах **начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь Мікалая СВІДЗІНСКАГА**, пакуль не распрацаваны паўнавартасныя дакументы, што датычацца ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе, цяжка гаварыць пра канкрэтныя змены ў прыродзе, якія могуць адбыцца пры рэалізацыі праекта. Але ўжо зразумела, што ўчасткі, праз якія пройдзе Е-40, патрабуюць асаблівай увагі.

— Прыпяцкае Палессе — вельмі каштоўныя прыродныя тэрыторыі для Еўропы, з вялікай колькасцю рэдкіх відаў жывёл і раслін, дзе сканцэнтраваны важныя шляхі міграцыі рыб і птушак, — адзначыў Мікалай Іванавіч. — І змена гідралагічнага рэжыму рэк (паглыбленне іх і будаўніцтва шлюзаў) можа негатыўна паўплываць на іх насельнікаў.

Адкрыццё шлюзаў, што злучаць басейны Балтыйскага і Чорнага мораў, можа справакаваць з'яўленне ў акваторыі беларускіх рэк нетыповых, чужародных відаў. Існуе вялікая рызыка дэградацыі каштоўных пойменных экасістэм і звязаных з імі лясных масіваў і воднабалотных угоддзяў, а таксама змянення відавога складу водных і каляводных жывёл.

Акрамя таго, не трэба забывацца і пра пытанні радыелагічнай бяспекі. Праходзячы праз тэрыторыю Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка, судны могуць закрануць забруджаныя донныя адклады. І немагчыма не думаць, што праз некаторы час яны могуць трапіць, напрыклад, у акваторыю Кіеўскага вадасховішча.

— Менавіта таму да планаў па аднаўленні воднага шляху Днепр—Вісла трэба адносіцца вельмі сур'ёзна і асцярожна, — упэўнены Мікалай Свідзінскі. — Неабходны іх глыбокі навуковы аналіз, правядзенне дасканалай ацэнкі ўздзеяння на навакольнае асяроддзе з улікам усіх магчымых як станоўчых, так і негатыўных наступстваў, а таксама шырокае грамадскае абмеркаванне.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

У свеце жывёл

# МЯДЗВЕДЗІ ВЫХОДЗЯЦЬ У ЛЮДЗІ

## Спецыялісты сцвярджаюць, што анамальныя паводзіны жывёл абумоўлены недахопам натуральнага корму

**МЯДЗВЕДЗЬ разбурыў гаспадарскі пчальнік, невядомы кіроўца насмерць збіў касалапага — такімі загалоўкамі стракацелі стужкі навін. Мы спыталі ў спецыялістаў, з чым звязаны візіты мядзведзяў у населеныя пункты, як сябе паводзіць чалавеку пры сустрэчы з царом лесу, і якія нормы закону дзейнічаюць у выпадку ДТЗ з удзелам жывёлы.**


Фота Дзяніса ІЎКОВІЧА.

### Звяры шукаюць ежу

«Па-першае, мядзведзі не ходзяць дзясяткамі, звычайна яны вядуць адасоблены лад жыцця, і толькі самкі ходзяць з медзведзянятамі. У перыяд спарвання могуць збірацца групы па 3–5 асобін, — кажа **навуковы супрацоўнік НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах, кандыдат біялагічных навук Ірына САЛАВЕЙ**. — Падругое, інфармацыю пра тое, што мядзведзі прыйшлі з тэрыторыі Расіі, таксама нельга назваць дакладнай, паколькі прасачыць гэта можна, напрыклад, па слядах або з дапамогай радыёашыйніка».

Па словах эксперта, цяпер у мядзведзяў перыяд нагашвання тлушчу, відавочна, ім бракуе корму. Сёлета з-за капрызаў надвор'я мала ягад, ды і яблыкі не ўсюды ўрадзілі. Мядзведзі могуць здабываць сабе на пракорм любых капытных, але гэта ў большай меры энергазатратна, чым пяданне лёгкадаступных раслінных кармоў.

«Што да візіту на пчальнік, то гэта звычайныя паводзіны для бурых мядзведзяў. Яны вельмі любяць мёд, адчуваюць яго на вялікай адлегласці, — працягвае Ірына Салавей. — Як вы заўважылі, толькі ў адным рэгіёне мядзведзі з'явіліся ў населеных пунктах. Трэба шукаць прычыны. Магу выказаць здагадку, што, магчыма, там высеклі нейкую дзялянку лесу ці бабры падтапілі тэрыторыю, якую насялялі мядзведзі. Пакуль у нас няма праекта па вывучэнні анамальных паводзін мядзведзяў».

### Убачыў мішку — не ўцякай

«Мядзведзь — досыць палахлівая жывёла і сам праяўляць агрэсію ў адносінах да чалавека не будзе, — супакоіў **вядучы навуковы супрацоўнік НПЦ па біярэсурсах Рыгор ЯНУТА**. — Небяспека можа быць толькі ў момант раптоўнага сутыкнення з чалавекам.

Калі ж давялося ўбачыць мядзведзя на невялікай адлегласці, можна адпужваць жывёлу гучнымі гукамі і ціхенька адыходзіць. Катэгарычна нельга ўцякаць! У шматлікіх жывёл, у тым ліку мядзведзя, закладзена на ўзроўні інстынкту: калі нейкая асобіна ўцякае, значыць, яна слабейшая і можна пачынаць паляванне».

Як варыянт хованкі ад мядзведзяў, Рыгор Янута раіць забрацца на дрэва на вышыню 2,5 метра — сталыя мядзведзі не могуць лазіць па дрэвах.

Спецыяліст адзначае, што на гаспадарскім пчальніку мядзведзь і сам будзе паводзіць сябе з асцярожнасцю, ён разумее, што ўварваўся ва ўладанні чалавека.

(Заканчэнне на 9-й стар.)

■ Далучайцеся!

# ЯК ВЫЖЫЦЬ У СУЧАСНЫМ ГОРАДЗЕ БЕЗ АЎТО

## Беларусь становіцца актыўным удзельнікам Еўрапейскага тыдня мабільнасці

**Больш як 1460 гарадоў у 40 краінах свету заявілі пра свой удзел у Еўрапейскім тыдні мабільнасці (ЕТМ), у тым ліку 19 гарадоў Беларусі. Між тым усяго два гады таму ў ім удзельнічала толькі тры нашы гарады.**

**Сёлета сталіца ўжо другі раз на афіцыйным узроўні далучылася да Еўрапейскага тыдня мабільнасці. Старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац падпісаў Хартыю аб далучэнні Мінска да ЕТМ.**

### У метро — па пасведчанні кіроўцы

Еўрапейскі тыдзень мабільнасці праходзіць кожны год з 16 па 22 верасня. Усе акцыі, якія адбываюцца ў гэты час, нагадваюць людзям пра негатыўны ўплыў аўтамабіляў на навакольнае асяроддзе і прапагандуюць выкарыстанне альтэрнатыўных спосабаў перамяшчэння.

Аўтамабілі не толькі забруджваюць атмасферу, але і забіраюць у нас грамадскую прастору: вуліцы і двары, а таксама зялёныя зоны. Ключавым мерапрыемствам ЕТМ з'яўляецца акцыя «Дзень без аўтамабіля» (22 верасня). У гэты дзень жыхары гарадоў пакідаюць свае машыны на стаянках і ў гаражах, а самі карыстаюцца грамадскім транспартам або веласіпедамі.

У Мінску кожны аўтаўладальнік зможа бясплатна скарыстацца наземным грамадскім транспартам і метро, прад'явіўшы замест праязнога білета пасведчанне кіроўцы і тэхпашпарт на машыну.

### Асветніцкая дзейнасць і практычныя вынікі

Мінскі гарадскі камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя распрацаваў план правядзення ЕТМ. Сёлета ён пройдзе пад дэвізам: «Аб'ядноўвацца дзеля будучыні».

На працягу Еўрапейскага тыдня мабільнасці ў Мінску будзе праведзена нямала асветніцка-адукацыйных кампаній, пазнавальных мерапрыемстваў, напрыклад, экскурсіі ў музей Мінскага метрапалітэна (папярэдні запіс па тэл .: 8(017) 219-60-67 і 8(017) 219-51-09), а таксама тэматычныя веласіпедныя і пешыя экскурсіі.

Асаблівая ўвага на працягу ЕТМ будзе ўдзелена дзецям. Мясцовы фонд садзейнічання развіццю міжнароднага дыялогу і супрацоўніцтва «Інтэракцыя» правядзе акцыю «ZUM. Дзеці ў руху», Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства 18—20 верасня запрашае школьнікаў прыняць удзел у экалагічным квэсце «Чыстае паветра».

«Мінскае веласіпеднае таварыства» запланавала правядзенне акцыі «На ровары на працу»: абсталяванне на вуліцах горада энергетычных і інфармацыйных кропак для веласіпедыстаў з фотазонамі, дзе яны змогуць бясплатна пачаставацца гарбатай, кавай, садавінай, атрымаць агітацыйную прадукцыю, інфармацыйныя матэрыялы аб правядзенні ЕТМ.

### Сусветны дзень без аўтамабіля ў Мінску

Праграма Дня без аўтамабіля, як заўсёды, вельмі насычаная. Так, на закрытым для транспарту ўчастку вуліцы Леніна (ад праспекта Незалежнасці да вуліцы Кірава) у гэты дзень з 16.00 да 21.00 будзе арганізавана свята, прысвечанае Дню без аўтамабіля. У праграме: выступленне творчых калектываў, шоу велакаскадзёраў, конкурс на самы лепшы падсвечаны веласіпед; прэзентацыя электрамабіляў; актыўныя гульні і віктарыны для дзяцей.

«Мінскае веласіпеднае таварыства», «Цэнтр экалагічных рашэнняў», «Ахова птушак Бацькаўшчыны», Мінскае гарадское ўпраўленне Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама падрыхтавалі таксама цікавыя прэзентацыі і конкурсы. Дзень без аўтамабіля завершыцца масавым велапрабегам ад вуліцы Леніна да Нацыянальнай бібліятэкі. Для ўдзельнікаў прабегу будзе выдзелена першая паласа руху па праспекце Незалежнасці.

### На навуковай аснове

На працягу ЕТМ Рэспубліканскі цэнтр па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя ў якасці эксперымента правядзе маршрутнае абследаванне стану атмасфернага паветра ў раёнах з рознай антрапагеннай нагрузкай. У прыватнасці, спецыялісты абследуюць аўтадарогу з інтэнсіўным рухам транспарту (скрыжаванне вуліц Я. Коласа і Кульман); зону адпачынку (Цэнтральны дзіцячы парк імя Горкага); зону рэкрэацыі («Парк камянёў»).



Мінскі гарадскі цэнтр гігіены і эпідэміялогіі правядзе эксперымент па вымярэнні ўзроўню шуму, створанага аўтатранспартам, і забруджвання паветра ў звычайны дзень і падчас правядзення акцыі (21 і 22 верасня).

### Менш аўто — чысцейшае паветра

Старшыня Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей Масляк падзяліўся некаторымі лічбамі па выніках мінулагодняй акцыі. Падлічана, што правам бясплатнага праезду ва ўсіх відах гарадскога транспарту скарысталася 8500 чалавек. У шоу падсвечаных веласіпедаў прынялі ўдзел 2500 чалавек.

Сяргей Масляк асабліва падкрэсліў экалагічны эфект ад фінальнага дня ЕТМ. Ён нагадаў, што доля шкодных выкідаў у навакольнае асяроддзе прамысловых прадпрыемстваў — 15—20%, усё астатняе — «заслуга» аўтамабільнага транспарту.

Як высветлілася па выніках замераў стану атмасфернага паветра, падчас мінулагодняй акцыі ў Мінску выкіды шкодных рэчываў скараціліся на 170 тон. У 2015 годзе гэтая лічба склала 100 тон.

Адным словам, чым больш людзей хоць бы часам адмовяцца ад асабістага аўто і перасядуць у грамадскі транспарт або на веласіпед, тым чысцейшае будзе паветра, якім мы ўсе дыхаем.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**
*yanovskaya@zviazda.by*

# ЧЫМ МЫ ДЫХАЕМ СЁННЯ?

**У асноўным, выкідамі ад прамысловых прадпрыемстваў, цеплаэлектрастанцый і аўтатранспарту. Але ў большасці беларускіх гарадоў якасць паветра ацэньваецца як стабільна добрая.**

Вядома, што бруднае паветра можа выклікаць інсульт, рак, сардэчна-сасудзістыя захворванні, зніжаць імунітэт і ўплываць на псіхічнае здароўе дарослых і дзяцей. Каб прадухіліць рызыку захворванняў, праводзіцца маніторынг атмасфернага паветра.

Сёлета спецыялісты Белгідрамета правяралі паветра на наяўнасць цвёрдых часціц, аксіду вугляроду, дыяксіду азоту, фармальдэгіду, аміяку, фенолу, серавадароду і сервувугляроду ў 19 гарадах краіны. У выніку, ва ўсіх прамысловых цэнтрах адзначалася наяўнасць у паветры свінцу і кадмію, у 16 з іх — бензапірэну, а ў 10 — лятучых арганічных злучэнняў. Аднак частыя і моцныя ападкі дапамаглі рассеяць забруджвальныя рэчывы.

Як расказала **начальнік аддзела маніторынгу атмасфернага паветра Белгідрамета Багдана КАЗЯРУК**, у той жа час у некаторых гарадах ёсць і «праблемныя» раёны. Напрыклад, у Мінску (вуліца Радыяльная) эпізадычна фіксуецца перавышэнне ЦЧ-10, асабліва ў пагодныя дні. Падобная сітуацыя назіраецца і ў Гомелі па вуліцы Барыкіна.

У Магілёве за апошні год якасць паветра значна палепшылася: адзначана зніжэнне ўзроўню забруджванняў дыяксідам азоту, серавадародам, бензолам, метылавым спіртам, і бензапірэнам. Праўда, у летні перыяд колькасць у паветры аміяку і фармальдэгіду стала вышэйшай, чым у іншых прамысловых цэнтрах краіны. Таксама пры неспрыяльных метэаралагічных умовах ва ўсіх раёнах горада адзначаны высокія канцэнтрацыі фенолу. Больш за ўсё паветра забруджана фармальдэгідам і аміякам у раёне вуліцы Каштанавай. Канцэнтрацыя аміяку ў паветры залежыць ад умоў надвор'я. У спякоту яна павялічваецца ў 2—3 разы.

**Маніторынг атмасфернага паветра праводзіцца ў 19 гарадах і прамысловых цэнтрах на 66 стацыянарных пунктах. На 15 пунктах вымярэнні ажыццяўляюцца кругласутачна.**

У Наваполацку ж пры неспрыяльных напрамках ветру, якія абумоўліваюць перанос забруджвальных рэчываў ад прамвузла, адзначаны перавышэнні нарматыву якасці па дыяксідзе серы.

— Варта адзначыць, што за апошні год заўважана істотнае зніжэнне наяўнасці забруджвальных рэчываў у атмасферных ападках. Канцэнтрацыі сульфатнай серы і акісленага азоту былі ў 5—6 разоў ніжэйшыя, чым у папярэднім годзе. Колькасць аднаўленага азоту ў атмасферных ападках, якія выпалі на станцыях Мсціслаў і Высокае, панізілася ў 1,2—1,6 раза, на станцыі Браслаў — у 2,8 раза, — расказала Багдана Казярук.

Знізілася таксама мінералізацыя ападкаў. Так, найбольшая паўтаральнасць (58%) выпадзенняў кіслых ападкаў характэрная для Мазыра, шчолачных — для Барысава, Гомеля і Полацка.

**Кацярына КІРЭЕВА.** *katyakireeva@zviazda.by*

# КУДЫ ПРЫВЯДЗЕ ШЛЯХ Е-40?

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Пры гэтым, па словах начальніка ўпраўлення, пры рэалізацыі любога праекта трэба памятаць пра прыярытэт захавання натуральных экалагічных сістэм, прыродных ландшафтаў і прыродных комплексаў, прадугледжаны Законам Рэспублікі Беларусь «Аб ахове навакольнага асяроддзя».

— Е-40 — гэта не адзіны аб'ект, а шматлікія тэрыторыі са сваімі асаблівасцямі, умовамі. І на кожным канкрэтным участку трэба прапліcваць усе магчымыя рызыкі, мінімізаваць іх, зрабіць усё тэхнічна і экалагічна правільна, — падкрэсліў Мікалай Свідзінскі.

## НАЦПАРК «ПРЫПЯЦКІ»: КАТЭГАРЫЧНА СУПРАЦЬ

«Будаўніцтва воднага шляху Е-40 на ўчастку Днепр—Вісла, які праходзіць праз тэрыторыю Нацыянальнага парку, катэгарычна недапушчальна. Правядзенне якіх-небудзь работ на рацэ Прыпяць, якая знаходзіцца ў межах парку, непрымальнае, таму што кожнае ўмяшанне прывядзе да парушэнняў і негатыўных уздзеянняў на прыродныя комплексы, — заявіў **генеральны дырэктар ДПУ «Нацыянальны парк «Прыпяцкі» Сцяпан БАМБІЗА**. — Агульнавядомы факт, што найбольшую цікавасць у плане захавання біяразнастайнасці жывёльнага і расліннага свету ўяўляе сабой участак ракі Прыпяць у межах нашага Нацпарку. Ён мае статус ключавой батанічнай тэрыторыі, то бок той, якая характарызуецца выключным батанічным багаццем».

Па словах Сцяпана Бамбізы, Нацпарк з'яўляецца тым месцам на Палессі, якое найбольш захавалася, дзе сабрана выключная разнастайнасць звяроў і птушак, раслін лугоў і лясоў, балот і вадаёмаў, якому няма аналагаў у свеце.

«Будаўніцтва воднага шляху Е-40 ставіць пад сумнеў не толькі існаванне Нацыянальнага парку «Прыпяцкі», але і іншых асаблівa ахоўных прыродных тэрыторый, размешчаных уздоўж ракі Прыпяць, — адзначае Сцяпан Бамбіза. — Выпрамленне ракі, яе паглыбленне, узвядзенне любых гідратэхнічных збудаванняў справакуе яшчэ большае парушэнне гідралагічнага рэжыму і як вынік — прывядзе да незваротных працэсаў у прыродных комплексах».

У Нацпарку «Прыпяцкі» растлумачылі, што ў апошнія гады з-за анамальнай спякоты, нават без умяшання ў асноўную артэрыю Палесся — раку Прыпяць, назіраюцца негатыўныя працэсы. Да іх можна аднесці ўсыханне на вялізарных тэрыторыях лясных масіваў, як ліставых, так і хвойных парод. Аслабленыя насаджэнні масава знішчаюць драўнінныя шкоднікі, толькі сёлета ў «Прыпяцкім» адведзена пад суцэльныя санітарныя высечкі 150 га хвойных насаджэнняў, і гэта толькі пачатак страт, папярэдзіць якія немагчыма.

Сцяпан Бамбіза таксама звярнуў асаблівую ўвагу на тое, што пры праектаванні воднага шляху Е-40 ніякіх узгадненняў з адміністрацыяй Нацыянальнага парку не рабілася, распрацоўка прапаноў па будаўніцтве гідратэхнічных збудаванняў, у тым ліку і на тэрыторыі парку, адбывалася ў закрытым, нават, можна сказаць, сакрэтным рэжыме.

## ПАДТРЫМКА СУСЕДА

Польскія калегі згодныя з меркаваннем беларускіх экалагаў. Як адзначыў **Пшэмыслаў НАЎРОЦКІ, прадстаўнік польскай кааліцыі «Выратуем рэкі» (Ratujmy rzeki)**, распрацоўшчыкі тэхніка-эканамічнага абгрунтавання спасылаюцца на дырэктывы Еўрапейскай камісіі, у прыватнасці, на «Еўрапейскую белую кнігу транспарту» 2011 года. У гэтай кнізе гаворыцца, што 30% грузаў, якія перавозяцца аўтамабілямі па тэрыторыі Польшчы, павінны перайсці да іншых відаў транспарту. Але грузы можа пераняць і чыгунка, што таксама зменшыць выкіды $CO_2$. Акрамя таго, Еўрапейская камісія патрабуе ад Польшчы рэалізацыі прыродаахоўных мерапрыемстваў, а Е-40 нясе патэнцыйную пагрозу біяразнастайнасці многіх рэк.

— Водны транспарт найбольш дэструктыўны з усіх існуючых. Праект прывядзе да знішчэння мінімум васьмі аб'ектаў «Прырода-2000» на Вісле і ўсіх аб'ектаў «Прырода-2000» у даліне Буга, — кажа Пшэмыслаў Наўроцкі. — Нагадаю, што рэкі маюць вялікі патэнцыял развіцця турызму. Магчыма, гэты кірунак дазволіць «прымірыць» эканамічнае развіццё і захаванне біяразнастайнасці. Мы не можам дапусціць, каб пад выглядам экалагізацыі адбывалася дэградацыя ўнікальных прыродных аб'ектаў.

## УЗВАЖЫЦЬ УСЕ «ЗА» І «СУПРАЦЬ»

Каб водны шлях Е-40 быў не толькі эканамічна, але і экалагічна выгадным, патрэбна дасканала прааналізаваць усе магчымыя (адмоўныя і станоўчыя) вынікі рэалізацыі гэтага праекта. Напрыклад, згодна з данымі распрацоўшчыкаў, аднаўленне воднага шляху дапаможа скарaціць шкодныя выкіды ад іншых відаў грузаперавозак — у разліку на 1 тонакіламетр эмісія $CO_2$ ад унутранага воднага транспарту ў 1,5 раза меншая за чыгуначны транспарт і ў 5 разоў меншая за грузавы аўтамабільны.

Пры гэтым асаблівую ўвагу неабходна ўдзяліць вывучэнню рызык негатыўнага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе і на дабрабыт мясцовых жыхароў, зрабіць праект максімальна адкрытым як для спецыялістаў, так і для грамадскасці. Толькі ўлічваючы ўсе бакі праблемы, яе можна вырашыць з максімальнай выгадай для кожнага.

**Вольга ПРАЛЮК,** *pralyuk@zviazda.by*
**Вераніка КОЛАСАВА.** *kolasava@zviazda.by*

■ Усё, што вы хацелі спытаць пра...

# АЗОНАВЫ СЛОЙ




**Нядаўна медыкі агучылі несуцяшальныя даныя — рак скуры заняў першае месца сярод усіх злаякасных новаўтварэнняў у беларусаў. Захворванне на гэту пухліну ў апошнія дзесяцігоддзі ўзрастае, а найбольш важным фактарам, які спрыяе развіццю раку скуры, з'яўляецца працяглае сонечнае апраменьванне. Спытаеце, пры чым жа тут азонавы слой? Адказваем.**

## Што такое азонавы слой?

Азонавы слой — гэта вобласць у стратасферы з найбольшым утрыманнем азону ($O_3$). Пад уздзеяннем ультрафіялетавага выпраменьвання Сонца малекулы кіслароду ($O_2$) распадаюцца на асобныя атамы, якія, злучаючыся з іншымі малекуламі гэтага хімічнага элемента, і ўтвараюць азон.

Па словах **вядучага навуковага супрацоўніка Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ Аляксандра КРАСОЎСКАГА**, колькасць гэтага рэчыва ў атмасферы вельмі малая: з 10 млн малекул паветра на долю азону прыходзіцца ўсяго тры. Але нават у такім аб'ёме ён амаль цалкам «стрымлівае» пагібельнае ўльтрафіялетавае выпраменьванне, стварае аптымальныя светлавы і тэрмічны рэжымы зямной паверхні, спрыяльныя для існавання жывых арганізмаў.

Азонавы слой размеркаваны над планетай нераўнамерна: яго таўшчыня ўзрастае ад экватара да полюсаў, да таго ж канцэнтрацыя азону можа змяняцца ў залежнасці ад сезона. Паводле вестак ННДЦ МА БДУ, агульная колькасць азону ў атмасферы над тэрыторыяй краіны ў апошнія гады ў асноўным блізкая да нормы.

## Калі ў атмасферы з'явіліся «дзіркі»?

Першым пра існаванне азону навуковай грамадскасці паведаміў фізік з Нідэрландаў Марцін Ван Марум (1785 год). У другой палове XX стагоддзя, падчас Міжнароднага геафізічнага года (1957—1958 гады) свет даведаўся пра ўразлівасць азону і небяспечны ўплыў на прыроду так званых «азонавых дзірак» — участкаў стратасферы, дзе значна зніжана агульная колькасць гэтага рэчыва.

Глабальнае памяншэнне колькасці стратасфернага азону назіраецца прыкладна з 1970-х гадоў. Над некаторымі раёнамі Антарктыкі ў верасні-кастрычніку значэнне агульнай колькасці азону памяншаецца амаль на 60%. У сярэдніх шыротах абодвух паўшар'яў памяншэнне складае 4—5% за дзесяцігоддзе.

## Хто «крадзе» азон?

У своеасаблівым топе рэчываў, якія ўплываюць на стан зямнога «шчыта», першыя месцы займаюць... вадзяная пара і аксіды азоту. Яны выкідваюцца ў стратасферу рэактыўнымі рухавікамі звышгукавых самалётаў і ракет. Вялікая колькасць аэразольных і газавых часціц пранікае і падчас вывяржэння вулканаў.

Але ў апошнія гады аднымі з асноўных вінаўнікаў разбурэння азонавага экрана лічаць бром і хлорфторвугляроды (ХФВ), да якіх адносяцца шматлікія фрэоны. Гэтыя штучна сінтэзаваныя рэчывы з 1930-х гадоў сталі шырока выкарыстоўвацца як холадагенты ў халадзільніках і кандыцыянерах, пенаўтваральныя агенты ў вогнетушыцелях, ачышчальнікі для электронных прыбораў і інш. Нетаксічныя, інертныя, не гараць і не раствараюцца ў вадзе, зручныя пры захоўванні... — тыя ж якасці, што дазваляюць іх паспяхова выкарыстоўваць у халадзільніках, даюць магчымасць фрэонам пранікаць у стратасферу і ператварацца там у «ліхадзеяў». Пад дзеяннем ультрафіялетавага выпраменьвання хлор і бром пачынаюць актыўна ўзаемадзейнічаць з азонам, разбураючы яго. За час свайго знаходжання ў верхніх слаях атмасферы адзін атам хлору ці брому можа разбурыць да 10 000 малекул азону.

## Небяспека для ўсяго жывога

Памяншэнне канцэнтрацыі азону на 1% выклікае павелічэнне інтэнсіўнасці цвёрдага ўльтрафіялетавага выпраменьвання каля паверхні Зямлі ў сярэднім на 2%.

Жорсткія ўльтрафіялетавыя прамяні валодаюць дастатковай колькасцю энергіі, неабходнай для разбурэння ДНК і іншых арганічных малекул. Паводле звестак Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, каля 25 захворванняў і парушэнняў стану здароўя чалавека звязана з залішнім уплывам ультрафіялетавага выпраменьвання. А развіццё такіх хвароб, як рак скуры (меланома), базальнаклетачная і пласкаклетачная карцыномы і катаракта, з'яўляецца прамым наступствам гэтага ўздзеяння.

Памяншэнне шчыльнасці азонавага шчыта цягне за сабой запаволенне працэсу фотасінтэзу ў прыродзе, зніжэнне ўраджаю сельскагаспадарчых культур і эфектыўнасці жывёлагадоўлі, рэзкае памяншэнне біялагічнай прадукцыйнасці прыпаверхневага слоя Сусветнага акіяна.

**Паводле звестак навукоўцаў, скарачэнне ГФВ можа прадухіліць да канца стагоддзя 0,4 °C глабальнага пацяплення, працягваючы ахоўваць азонавы слой.**




**Размеркаванне азону ў верасні 1979 і 2016 гг. (NASA's Goddard Space Flight Center).**

**Азонавы слой утварыўся ў атмасферы Зямлі 500—600 млн гадоў таму, калі ў ёй назапасілася досыць кіслароду.**

## Азонавая палітыка

У 1985 годзе ў Вене была прынятая Канвенцыя аб ахове азонавага слоя, а ў 1987-м — Манрэальскі пратакол па рэчывах, якія разбураюць азонавы слой. Беларусь у ліку першых падпісала і ратыфікавала гэтыя міжнародныя дакументы і актыўна выконвае ўзятыя на сябе абавязацельствы.

Дзякуючы рэалізацыі рэспубліканскіх праграм і міжнародных праектаў, у краіне выводзяцца з абароту гідрахлорфторвугляроды (ГХФВ) і ўкараняюцца ў вытворчасць азонабераглівыя тэхналогіі.

— Калі ў канцы 1980-х гадоў спажыванне азонаразбуральных рэчываў у Беларусі складала каля 3000 тон, то ў 2016 годзе — усяго 51,5 тоны, — адзначае **кансультант аддзела рэгулявання ўздзеянняў на атмасфернае паветра і азонавы слой Мінпрыроды Наталля КЛІМЕНКА**.

Па словах спецыяліста, у нашай краіне азонаразбуральныя рэчывы не вырабляюцца, але ўвозяцца з-за мяжы для выкарыстання ў якасці холадагентаў. З мэтай выканання абавязацельстваў па міжнародных дамовах Беларусь павінна спыніць спажыванне (імпарт) гідрахлорфторвугляродаў з 2020 года.

— Гэта не значыць, што ўсе спажыўцы абсталявання, якое працуе на такіх рэчывах, з 2020 года спыняць яго эксплуатацыю, — тлумачыць Наталля Васілеўна. — Абсталяванне будзе выкарыстоўвацца, пакуль яно тэхнічна спраўнае. У краіне створаны рэсурсавыя цэнтры па рэцыклінгу і аднаўленні такіх рэчываў, якія дазволяць і надалей выкарыстоўваць фрэоны для запраўкі дзеючага абсталявання.

## Новыя выклікі

Каб знізіць выкарыстанне азонаразбуральных рэчываў, шматлікія краіны пачалі ўжываць у якасці холадагентаў гідрафторвугляроды (ГФВ). Яны не валодаюць азонаразбуральнай здольнасцю, але, як лічаць вучоныя, маюць значны патэнцыял глабальнага пацяплення.

На 28-й нарадзе Бакоў Манрэальскага пратакола (2016 год, г. Кігалі (Руанда)) Бакамі прынята папраўка да пратакола ў адносінах рэгулявання выкарыстання ГФВ. З'явіўся дадатак F: «Гідрафторвугляроды», які складаецца з 18 такіх рэчываў.

Прыняцце гэтай папраўкі цягне неабходнасць выпрацоўкі мер па скарачэнні выкарыстання ГФВ шляхам уводу ліцэнзавання рэгулявання іх імпарту (экспарту), як гэта адбываецца ў адносінах да азонаразбуральных рэчываў.

Па словах Наталлі Кліменкі, у межах чарговага праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі ГЭФ «Завяршэнне выкарыстання ГХФВ з падтрымкай тэхналогій з нізкім патэнцыялам глабальнага пацяплення ў Беларусі» прадугледжана правядзенне ацэнкі маштабаў выкарыстання гідрафторвугляродаў і адпаведна вызначэнне кошту выдаткаў па пераходзе на выкарыстанне альтэрнатыўных заменнікаў. Па іх выніках трэба будзе выпрацаваць пазіцыю адносна ратыфікацыі Беларуссю Кігальскай папраўкі да Манрэальскага пратакола.

**Вераніка КОЛАСАВА.**
*kolasava@zviazda.by*

### Як захаваць азонавы слой і абараніць сябе ад ультрафіялету:

— не разбірайце і не рамантуйце самастойна старыя халадзільнікі і кандыцыянеры (у наваколльнае асяроддзе могуць патрапіць фрэоны). Здавайце іх на перапрацоўку!

— купляйце тэхніку і аэразолі, якія змяшчаюць толькі азонабяспечныя рэчывы;

— абмяжоўвайце час знаходжання на адкрытым сонцы;

— падчас доўгага знаходжання на сонцы выкарыстоўвайце ахоўнае адзенне, галаўныя ўборы, спецыяльны крэм і сонцаахоўныя акуляры.

**16 верасня адзначаецца Міжнародны дзень аховы азонавага слоя. У гонар 30-й гадавіны падпісання Манрэальскага пратакола сакратарыят па азонавым слоі аб'явіў інфармацыйную кампанію з хэштэгам #OzoneHeroes. Яна стартуе 14 верасня і заклікана адзначыць галоўныя дасягненні ў ахове азонавага слоя і барацьбой са змяненнем клімату.**

# МЯДЗВЕДЗІ ВЫХОДЗЯЦЬ У ЛЮДЗІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

У Беларусі, па звестках НПЦ па біярэсурсах, прыкладна 120 асобін мядзведзяў, у асноўным яны лакалізавана насяляюць Віцебскую вобласць. Рыгор Янута расказаў, што калі ён з калегамі вывучаў павадзіны мядзведзяў, спецыялістам у якасці абароны ад жывёл выдалі фальшфееры, аднак скарыстацца імі не прыйшлося, таму сказаць пэўна, ці баяцца мядзведзі агню, немагчыма.

У той жа Віцебскай вобласці адміністрацыя базы адпачынку скардзілася, што мішка панадзіўся з рэвізіяй да кантэйнернай пляцоўкі. Як толькі харчовыя адходы прыбралі з даступнага месца, мядзведзь страціў цікавасць да візітаў на базу адпачынку.

## Жывёлы не ведаюць правілаў дарожнага руху

Нагадаем, што 28 жніўня супрацоўнікі Бялыніцкай ДАІ на трасе Мінск—Магілёў знайшлі збітага насмерць сталага мядзведзя. Кіроўца з месца ДТЗ уцёк, і пакуль яго асоба не ўстаноўлена.

Начальнік АДАІ Бялыніцкага РАУС Максім Кундалёў расказаў, які алгарытм дзеянняў кіроўцы ў выпадку сутыкнення аўтамабіля з жывёлай:

«Першае правіла пры здзяйсненні ДПЗ: не пакідаць месца здарэння, неадкладна паведаміць пра яго ў органы ўнутраных спраў па тэлефоне 102. Па магчымасці запісаць нумары тэлефонаў, прозвішчы сведак. Мы прыязджаем на месца ДТЗ, афармляем адпаведныя дакументы, апытваем кіроўцу і, калі ёсць, — сведак.

Зыходзячы з практыкі, магу сказаць, што часцей за ўсё пры разглядзе ДТЗ з удзелам жывёл высвятляецца, што звер раптоўна выйшаў на праезную частку, і кіроўца не меў магчымасці прадухіліць сутыкненне».

Што да кіроўцы, які збіў мядзведзя, то нельга выключаць, што ў факце самога наезду не будзе складу злачынства, а вось за ўцёк з месца ДТЗ прыйдзецца адказаць.

Як расказаў Максім Кундалёў, па ДТЗ з удзелам жывёл дзяржінспектары працуюць у цесным кантакце з супрацоўнікамі лясгасаў. Траўміраваных жывёл перадаюць спецыялістам лясгасаў для аказання дапамогі.

З пачатку года ў Бялыніцкім раёне адбылося 17 ДТЗ з удзелам жывёл. Супрацоўнікі ДАІ рэкамендуюць дарожнай службе ўстанавіць дадатковую агароджу, а лясгасу — кантраляваць міграцыю дзікіх жывёл.

## Браканьеры без стрэльбы

Як растлумачылі ў прэс-службе Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце, у лістападзе 2014 года набыў сілу арт. 282, заўв.1 Крымінальнага кодэкса — незаконнае перамяшчэнне (транспартаванне) ці разбіранне туш дзікіх жывёл. Артыкул КК датычыцца не толькі браканьераў, але і кіроўцаў, якія, самі збіўшы жывёлу ці падабраўшы тушу на дарозе, хаваюць яе ў багажнік машыны. Пакаранне за незаконнае транспартаванне ці разбіранне дзікіх жывёл прадугледжана ад штрафу, ці выпраўленчых работ на тэрмін да двух гадоў, ці арышту да пазбаўлення волі на тэрмін да трох гадоў. Пры прызначэнні пакарання ўлічваюцца такія нюансы, як паўторнасць парушэння, прыналежнасць жывёлы да ахоўных відаў, здзяйсненне злачынства на асоба ахоўных ці радыеактыўна забруджаных тэрыторыях. Акрамя таго, суд нярэдка прымае рашэнне пра канфіскацыю ў даход дзяржавы аўтамабіля, як сродку здзяйснення злачынства.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.** *yanovskaya@zviazda.by*

■ Гасцёўня

# «ДЛЯ ЗЕМЛЯКОЎ-БЕЛАРУСАЎ»

## Выйшаў пераклад Новага Запавету на родную мову, зроблены праваслаўнай царквой

**«Новы Запавет Госпада нашага Ісуса Хрыста» — выданне з такой назвай было прэзентавана на Дні беларускага пісьменства ў Полацку. Гэта новы пераклад Свяшчэннага Пісання на беларускую мову. Зроблены ён Біблейскай камісіяй Беларускай праваслаўнай царквы. У склад камісіі ўвайшлі протаіерэй Сергій Гардун, кандыдат багаслоўя протаіерэй Аляксандр Пачопка, бакалаўр багаслоўя Іван Чарота, доктар філалагічных навук Уладзімір Васілевіч, кандыдат філалагічных навук Алесь Кароль і кандыдат багаслоўя Тацццяна Матрунчык. Протаіерэй Сергій Гардун расказаў усе падрабязнасці стварэння такога важнага перакладу:**

«Ідэя ўзнікла яшчэ ў канцы 1980-х гадоў — як толькі пачалася перабудова і стала можна святарам займацца такой сур'ёзнай творчасцю. Дагэтуль дзейнасць любой духоўнай асобы абмяжоўвалася сценамі храма і богаслужэннем. Да таго ж не было ўмоў для выдання: калі б мы зрабілі гэты пераклад 40—50 гадоў таму, яго б усё адно ніхто не выдаў. І толькі калі з'явілася перспектыва, што праца можа пабачыць свет, мы сталі працаваць.

Мітрапаліт Філарэт благаславіў стварэнне Беларускай біблейскай камісіі. Яна складаецца са святароў, з некалькіх праваслаўных асоб, што маюць не толькі багаслоўскую, але і філалагічную адукацыю, а таксама з прыхаджан нашых храмаў — дактароў філалагічных навук, членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі. Мы стварылі такую групу і пачалі працаваць.

Справа ішла доўга, бо напачатку мы нават не ўсе жылі ў Мінску. Выбіралі дзень, у які можна прыехаць і сустрэцца. Я, напрыклад, служыў у Слоніме ў той час. З 1994 года я жыву ў Мінску, і гэтыя сустрэчы зрабіліся больш рэгулярнымі.

Такім чынам, паступова працавалі. У адрозненне ад іншых перакладаў, якія ўжо рабіліся на беларускую мову, — напрыклад Васіля Сёмухі, ксяндза Уладзіслава Чарняўскага, даваенных перакладаў, — мы перакладалі з арыгіналаў, са старажытнагрэчаскага тэксту.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### МАТЭУШ ЦІ МАЦВЕЙ?

Што датычыць тэрміналогіі (бо ў розных перакладах яна розная), то тут усё абумоўлена нашай гісторыяй. Каб стала зусім зразумела, скажу, што мы ўсе — хто любіць беларускую мову, шануе яе, карыстаецца ёй — размаўляем на адной мове. Тым не менш у плане канфесійным тэрміны вельмі адрозніваюцца. Скажам, словы «царква» і «касцёл», па сутнасці, абазначаюць будынак для малітвы. У той час як у любой іншай мове для абазначэння гэтых паняццяў выкарыстоўваецца адно і тое ж слова, у нас выкарыстоўваюцца два розныя, якія не замяняюцца адно адным. Гэтаксама некаторыя паняцці, назвы свят розныя. Безумоўна, рабілі пераклад у першую чаргу для праваслаўных вернікаў. Калі ў каталіцкіх перакладах імёны выглядаюць як Матэуш (на польскі манер), то ў нас — Мацвей. Арыентаваліся на імёны, найбліжэйшыя да арыгінала і што людзі прывыклі чуць у храме на царкоўнаславянскай мове.

### ПАНЯДЗЕЛАК ЦІ ПАВАСКРЭСНІК?

У некаторых выпадках праваслаўныя і каталікі згодныя ў выбары таго ці іншага слова: напрыклад, усюды ўжываецца слова «благаславенне» — і ў гэтым яны адзінадушныя. Але многім свецкім аўтарам яно не падабаецца. А слова «дабраславенне» створана штучна, няма ніякіх фальклорных запісаў, каб хтосьці так гаварыў ці пісаў у XVII, XVIII, XIX стагоддзях. Яно створана ў XX стагоддзі, і мы лічым, што гэта няправільна. Ёсць старажытныя словы, якія заўжды ўжываліся, — не было такога часу, каб іх не выкарыстоўвалі.

Простае слова «панядзелак» — таму што «пасля нядзелі». Раней гэты дзень тыдня, які па-беларуску мы называем «нядзеля», называўся і ў Расіі нядзеляй. Потым яго сталі называць «воскресенье». Але з-за гэтага яны не вырашылі перайменаваць панядзелак і назваць яго «повоскресником». Прыкладна такая ж логіка ў тых, хто не дапускае слова «благаславенне». Усе гэтыя выпадкі мы аналізавалі нашай камісіяй і рабілі адпаведны пераклад.

### 6000 І 30 000 АСОБНІКАЎ?

Гэты пераклад ужо быў апрабаваны. Мы спачатку выдавалі яго часткамі. Яшчэ ў 1991 годзе надрукавалі Евангелле паводле Мацвея. Праз некалькі гадоў Марка, Лукі, Іаана. Потым надрукавалі кнігу Дзеянняў апостальскіх. Прычым гэтыя выданні вельмі навуковыя па сваёй форме, бо спачатку ідзе арыгінальны старагрэчаскі тэкст, затым царкоўнаславянскі, рускі сінадальны пераклад XIX стагоддзя і наш беларускі. Калі людзі добра ведаюць мовы, то па гэтых перакладах можна было ўбачыць розныя адценні сэнсу. У 2007 годзе мы выдалі богаслужэбнае Евангелле — чатырох евангелістаў. Аднак гэта былі не проста тэксты, але з пазначэннем, які ўрывак у які дзень на працягу ўсяго года чытаецца. Вельмі зручна святару — адкрыць і прачытаць. І людзі набывалі гэтыя кнігі, і ў многіх храмах яны ўжываюцца. І калі заўважаліся нейкія недакладнасці, абдрукоўкі, то ў новым выданні, натуральна, іх выпраўлялі.

Спадзяёмся, што гэта выданне не апошняе і будуць яшчэ перавыданні. Я нават магу наперад раскрыць таямніцу. Паколькі віртуальны пераклад у інтэрнэце ўжо быў даступны і яго можна было ўбачыць, то замежныя беларусазнаўцы са Злучаных Штатаў Амерыкі, Канады, Польшчы, ведаючы пра нашу працу, папрасілі азнаёміцца з ёй больш падрабязна і выказаць свае заўвагі. Таму зараз прынята рашэнне ў міжнароднай арганізацыі, што ўжо да канца года пераклад будзе перавыдадзены, магчыма, у ЗША. Яны вырашылі зрабіць такі падарунак беларусам. Калі мы на царкоўныя грошы надрукавалі толькі 6000 асобнікаў. То там збіраюцца надрукаваць 30 000 асобнікаў, прывезці сюды і распаўсюдзіць. Гэта будзе маленькі фармат. І яны хочуць, каб выданне было не толькі для праваслаўных, але і для католікаў, і для пратэстантаў.

Цяпер на вокладцы кнігі змешчаны Ефрасіннеўскі крыж, аднак гэта праваслаўная святыя, а пратэстанты не шануюць святых. Пратэстанты часам выкарыстоўваюць чатырохканцовы крыж, як сімвал. Вядома, я раіў замежным выдаўцам усё-такі выкарыстаць Ефрасіннеўскі крыж, які мае яскравы беларускі характар. Спадзяюся, я іх пераканаў.

### А ЯК СКАРЫНА?

Безумоўна, робячы сваю працу, мы заўсёды памяталі пра Скарыну, яго імкненне зрабіць тэкст Свяшчэннага Пісання больш даступным, зразумелым. Паўтару словы акадэміка Жураўскага: «Мова, на якой Скарына выдаў Свяшчэнае Пісанне — гэта царкоўнаславянская мова ў беларускай рэдакцыі». Ён абеларусіў царкоўнаславянскую мову настолькі, наколькі лічыў патрэбным, каб гэта было зразумела.

Мы памяталі гэты прынцып Скарыны. Бо часам, калі перакладаюць на беларускую мову, стараюцца прыдумаць такія тэрміны, каб былі як мага больш не падобнымі на рускія. Мы такой мэты не ставілі. Мы акурат хацелі захаваць традыцыю. У мове Скарыны многа царкоўнаславянізмаў. І ў нашым перакладзе гэту традыцыю арыентацыі на царкоўнаславянскую мову захоўваем.

Скарына, хоць і ў Празе пачаў выдаваць свае кнігі, працягнуў у Вільні, але, безумоўна, рабіў гэта для землякоў-беларусаў. А нам, дзякуй Богу, стала магчыма працаваць у сталіцы нашай краіны, у Мінску. Прэзентацыя выдання, сімвалічна, адбылася ў Полацку.

### ЯШЧЭ І ПСАЛТЫР?

Мы думаем працягваць працу. Скарына спачатку выдаў Псалтыр, а затым Новы Запавет. Мы пачалі ўсё-такі з Новага Запавету. Спадзяёмся, што да 500-годдзя выхаду яго апошняй кнігі, Апостала, у 2025 годзе, паспеем перакласці яшчэ і Псалтыр. Атрымаецца крышку наадварот, але ў сугучнасці са Скарынам.

Гэта выданне, праца беларускай Біблейскай камісіі — сведчанне таго, што словы Госпада Ісуса Хрыста, якія Ён сказаў сваім апосталам: «Ідзіце і навучыце ўсе народы, хрысцячы іх у імя Айца і Сына і Святога Духа, і вучачы іх выконваць усё, што я запаведаў вам», — гэта і сёння прынцып дзеяння для царквы. І мы працягваем гэту традыцыю».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*
*г. Полацк*

■ За падзеяй

# Прыступкі да духоўнага багацця

## Пра станаўленне рэлігійнага жыцця ў краіне расказвае выстаўка ў Нацыянальным гістарычным музеі

**Праваслаўе, каталіцызм, іўдаізм, іслам — усе асноўныя рэлігіі свету гарманічна суіснуюць у адной зале выстаўкі «Беларусь. Адраджэнне духоўнасці», як і ва ўсёй краіне. Не абышлося тут і без экспанатаў часоў язычніцтва — першых спроб нашых продкаў растлумачыць сутнасць чалавечага жыцця. Усе гэтыя вераванні — прыступкі, якія вызначылі нацыянальныя асаблівасці духоўнага аблічча беларусаў і працягваюць удзельнічаць у фарміраванні каштоўнасцяў грамадства.**

Статус міжнароднага праект «Беларусь. Адраджэнне духоўнасці» атрымаў дзякуючы дапамозе Дзяржаўнага гістарычнага музея Масквы, адкуль адмыслова для ўдзелу ў выстаўцы прывезлі ў Мінск унікальны помнік кнігадрукавання — пражскае выданне Біблii Скарыны 1517 года, які знаходзіцца ў музеі з XIX стагоддзя. Каштоўны асобнік Біблii захоўваецца ў самых спрыяльных умовах: выданне змясцілі пад каўпаком, дзе падтрымліваецца тэмпература 15—17 градусаў і вільготнасць 50—60 працэнтаў. Аднак наведвальнікі экспазіцыі ўсё роўна могуць пагартаць старонкі рарытэта з дапамогай сучасных лічбавых тэхналогій: расіяне адсканавалі асобныя фрагменты Біблii. Наяўнасць такога экспаната на выстаўцы ў год 500-годдзя беларускага кнігадрукавання — вельмі істотны ўнёсак у святкаванне Дзён беларускага пісьменства. Падчас адкрыцця экспазіцыі **міністр культуры Барыс СВЯТЛОЎ** зазначыў, што Францыск Скарына для яго — адна з найвялікшых загадак у культуры.

Абразы, карціны, нацыянальныя строі, уборы святароў, рукапісныя і стадрукаваныя кнігі, археалагічныя знаходкі — экспазіцыя аб'ядноўвае больш як 400 рарытэтаў. Пачэснае месца ў музеі займаюць пячатка Ефрасінні Полацкай XII стагоддзя і сцэнапіс Праабражэнскай царквы Спаскага манастыра ў Полацку XIX стагоддзя. Сучасныя экспанаты для выстаўкі «Беларусь. Адраджэнне духоўнасці» прадставіў Свята-Елісавецінскі манастыр.


Фота БЕЛТА.

**Найкаштоўнейшы прадмет на выстаўцы — пражскае выданне Біблii Францыска Скарыны 1517 года, якое захоўваецца ў дзяржаўным гістарычным музеі Масквы.**

Звярнуцца да гісторыка-культурных каштоўнасцяў краіны Нацыянальнаму гістарычнаму музею дапамаглі Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі, Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей, Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, Гомельскі палацава-паркавы ансамбль, Музей Інстытута гісторыі НАН Беларусі і Музей старажытнабеларускай культуры НАН Беларусі.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

■

Пантэон Айчыны

# СОФ'Я ГАЛЬШАНСКАЯ (1405—1461)



Ян Матэйка. «Каралева Соф'я Гальшанская з сынамі. 1880 год».

Здаўна Беларусь славілася сваімі прыгажунямі. Узяць хаця б полацкую князёўну Рагнеду, за руку якой змагаліся кіеўскі князь Яраполк і наўгародскі князь Уладзімір. Беларускіх княгінь ахвотна бралі за сябе візантыйскія імператары, дацкія каралі, рускія князі, вялікія князі літоўскія. Але, як звычайна, іх лёс схаваўся за венцаноснымі постацямі мужоў. Соф'і Гальшанскай у гэтым сэнсе пашчасціла больш. Цікавасць да юнай княгіні, якая стала польскай каралевай, нарадзіла спадкаемцаў каралеўскай кароны, чым, па сутнасці, выратавала каралеўства ад занепаду, прыцягвала храністаў і гісторыкаў. Непрыхільнікі са зласлівасцю ачарнялі яе вобраз, а прыхільнікі ўзвялічвалі.

Лацінамоўны паэт Ян Вісліцкі вобразна апісваў, як багі выбіралі састарэламу каралю Ягайлу жонку. Багіня прыгажосці Венера паказала на Соф'ю Гальшанскую: «Ёсць у мяне беларуская німфа, слаўная па ўсіх краінах, німфа, цудоўнейшых дзяўчат няма, багінь пераўзыходзіць. Соф'яй яе называюць у народзе і аратыя славяць. Чароўнасцю аблічча, як і прыгажосцю гаворкі, старажытных прыгажунь у цені пакідае... шлюбам ганаровым звязаць я вырашыла з прастола ўладаром гэтую княжну і патомствам дастойным упрыгожыць нявесту». Вось так і нараджаюцца міфы, а з іх гісторыя.

Вядома, не багі выбіралі Ягайлу жонку, а людзі. Пасля трох нешчаслівых шлюбаў Ягайла не меў сыноў. Гэтая акалічнасць не магла не трывожыць палякаў, бо са смерцю Ягайлы яны пазбаўляліся сваёй каралеўскай дынастыі і прэтэнзій на землі ВКЛ. Справа жаніцьбы састарэлага караля зрабілася найважнейшай дзяржаўнай справай. Патрабавалася не толькі ажаніць караля, але і каб маладая каралева нарадзіла яму сыноў. Розныя палацавыя партыі і групоўкі шукалі выгадную сабе кандыдатуру каралеўскай жонкі. Прыхільнікі нямецкай люксембургскай дынастыі хацелі дачку імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі Сігізмунда I Альжбету, за якую той даваў у пасаг Шлёнск. Патрыёты разумелі, што гэта сыр у мышалоўцы, бо пасля Ягайлавай смерці без спадкаемцаў імператар прад'явіў бы правы на польскі каралеўскі пасад. Меў свае планы і вялікі князь Вітаўт, які хацеў бачыць каралеўскай жонкай сястру сваёй трэцяй жонкі Соф'ю Гальшанскую. Яна была дачкой князя Андрэя Гальшанскага і княгіні Аляксандры Друцкай. Асірацеўшы, Соф'я разам са старэйшай сястрой выхоўвалася ў матчынага брата князя Сымона Друцкага (магчыма, нашчадка полацкіх князёў). Калі верыць «Хроніцы Быхаўца», Вітаўт прывёз Ягайлу ў Друцк, дзе той убачыў сясцёр Гальшанскіх і ўпадабаў прыгажуню Соф'ю. На просьбе караля Вітаўт сасватаў яму Соф'ю. 7 лютага 1422 г. у Наваградскім фарным касцёле Ягайла і Соф'я абвянчаліся. Перад вянчаннем яна перайшла ў каталіцтва. Ягайла паставіў свой двор перад здзейсненым фактам, хітра ўнікнуўшы інтрыг. Пышнае вяселле было адсвяткавана ў Лідзе. Жаніцьба караля адбылася не па польскім сцэнарыі, а як вызначыў Вітаўт.

Маладую літвінку неўзлюбілі пры двары, лічылі шчаслівай выскачкай, не вартай быць польскай каралевай. Але нягледзячы на ўсе інтрыгі, Ягайла дамогся яе каранацыі. І цяпер Соф'я пачувалася гаспадыняй каралеўскага двара. Каралеву акружалі маладыя польскія рыцары, закаханыя ў сваю гаспадыню. І тут мы сутыкаемся з тайнай тайнаў дынастыі Ягелонаў і ўвогуле польскай гісторыі.

Многія ў Польшчы сумняваліся, што тры сыны, якіх нарадзіла Соф'я, былі ад састарэлага Ягайлы. Занадта была падазронай такая нечаканая пладнасць бясплоднага старога караля. Соф'ю западозрылі ў нявернасці і ў сувязях са шляхцічам Генрыхам (Гіньчам) з Рогава. Служанкі каралевы пад катаваннямі назвалі імёны яшчэ семярых яе каханкаў. Справа набывала ледзь не міжнародны размах. Падазравалі, што плёткі нарадзіліся ў Ордэне. У Вільні за гэтыя плёткі судзілі нейкага польскага шляхціча. Апынуліся ў вязніцы і абгавораныя служанкамі шляхцічы, а Гіньча ўцёк з каралеўскага двара і схаваўся. Каралева прынесла прысягу ў сваёй вернасці, так што і кароль паверыў (ці зрабіў выгляд) у невінаватасць жонкі, і іншыя прыціхлі. Хоць рэха гэтага скандалу даносілася ажно да XVI ст., калі антыягелонскія сілы адмаўлялі нашчадкам Ягайлы ў праве быць каралямі, як незаконнанароджаным.

Як бы там ні было, але Соф'я дамаглася свайго — яна стала маці каралевічаў, якіх палякі прызналі за спадкаемцаў польскай кароны. Як маці яна магла быць шчаслівая. Але каралеўскае паходжанне яшчэ не азначае прыхільнасці лёсу, часам, наадварот, лёс няміласцівы да каралеўскай крыві. Памёр немаўляткам другі сын Казімір, загінуў у 20-гадовым узросце ў 1444 г. у бітве з туркамі пад Варнай першынец Уладзіслаў, якога выбралі польскім і венгерскім каралём. (Апошнім часам з'явілася неверагодная версія, што Уладзіслаў збег з бітвы і стаў марахадам пад імем Хрыстафор Калумб.) Соф'я доўга не верыла ў смерць сына, з надзеяй чакала яго вяртання і не дачакалася.

Вось так замест сямейнага шчасця — жыццё з нялюбым старым, сумнае ўдаўство, страта сыноў, замест радасці боль у сэрцы. Цяпер яна прысвяціла сябе ўладкаванню лёсу малодшага сына Андрэя Казіміра, якога ў 1434 г. літвіны і русіны абралі сваім гаспадаром. Ён упарта адмаўляўся быць польскім каралём. Соф'я ўгаворвала сына, каб «здароўю ўжываў раду» і не слухаўся літвінаў. Зрэшты, ездзіла сама ў Літву, дзе ў Гародні настаяла на згодзе Андрэя Казіміра стаць польскім каралём, бо палякі маглі выбраць варожага Літве князя Баляслава Мазавецкага. Гэта адзін з эпізодаў палітычнай дзейнасці Соф'і Гальшанскай. Яе ўплыў на многія падзеі і справы быў відавочны. Як бачым, не без яе ўдзелу Андрэя Казіміра абралі польскім каралём, як раней вялікім князем літоўскім і рускім, якім апекаваліся князі Гальшанскія. Уплыў Соф'і адчуваецца ў рашэннях Казіміра на карысць ВКЛ. Напрыклад, насуперак патрабаванням палякаў ён не далучыў да Польшчы Усходнюю Валынь. Каралева не забывала радзіму і як магла спрыяла ёй. Яна ў 1428 г., будучы ў Вільні, угаварыла Вітаўта прыняць каралеўскую карону і парваць унію з Польшчай. Падтрымлівала і Свідрыгайлу ў яго імкненні захаваць суверэнітэт Вялікага княства.

Можа быць, яе старасць (а па нашых мерках сталасць) была шчаслівая. Соф'я дачакалася ўнукаў ад шлюбу Андрэя Казіміра і Альжбеты Габсбург, чацвёртага ўнука яна назвала Аляксандрам, хросным імем свайго дабрадзея Вітаўта. Памерла ў 56-гадовым узросце 21 верасня 1461 года. Паводле Яна Длугаша, была яна «жанчына вельмі дабрадзейная, шчодрая да касцёла і ласкавая да ўбогіх. Сэрца мела велікадушнае і ўзнёслае».

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

■ Сваімі словамі



# АБЯЦАННІ САБЕ

Што рабіць, калі не маеш уласнага замка?

**Гісторыю робяць упартыя. І тыя, хто не баіцца падавацца іншым дзівакамі. Хутчэй наадварот, людзі, напэўна ж, будуць задаваць пытанні, разводзіць рукамі ў неразуменні... Праз пару хвілін увогуле забудуць пра тваё існаванне і спыняць свой здзеклівы смех. І толькі праз гады (тваёй упартай і няспыннай працы), калі стануць бачныя вынікі, яны моцна здзівяцца яшчэ раз: «Вой, а калі паспеў?.. І чаму ў мяне няма такога?..» Насамрэч шанцы ад пачатку роўныя ва ўсіх.**

Іван Пячынскі, дырэктар Дабрачыннага фонду «Любчанскі замак» распавядаў, што ў яго жыцці ўсё змяніла цяжкая хвароба. Адночы стала вельмі дрэнна, трапіў у бальніцу. Было адчуванне, што лёс вось-вось можа абарвацца. Адразу перад вачыма пранеслася ўсё жыццё... Што ў ім было, што значнага паспеў зрабіць? Тут жа прыгадалася, што ў родным мястэчку Любча стаіць занядбаны замак. Паступова ператвараецца ў руіны (ён ужо быў руінамі на той час), запаўняецца смеццем. Прыгадалася, як у школьныя гады гулялі ў баскетбол у адной з вежаў, не дбаючы моцна пра яе гістарычнасць... Іван Антонавіч тут жа паабяцаў сабе, што калі ўдасца выкараскацца, то прысвеціць сваё жыццё аднаўленню старажытнага мура на малой радзіме... Хтосьці падумае, што гэта блюзнерства. Іншы, выздараўеўшы, забудзецца на свае абяцанні. Але не Пячынскі. Жыццё падарыла яму другі шанц. І гэты шанц стаў таксама і карткай у новае жыццё для старажытнага мура.

Іван Антонавіч любіць прыгадваць, што ў яго характарыстыцы — яшчэ з тых часоў, як служыў у войску — напісана: «Пачатую справу даводзіць да канца». Таму ўзяўшыся і за гэты гуж, ён аказаўся моцным.

Усё пачыналася спакойна і не шумна. З афармлення дабрачыннага фонду. Са збору вакол сябе аднадумцаў. З вывазу на возе смецця з сутарэнняў вежаў.

Знаёмыя архітэктары заселі за распрацоўку канцэпцыі і пошук гістарычных матэрыялаў, каб даведацца, як выглядаў замак? Давялося час патраціць і на пошук спонсараў: не кожны зробіць уклад у руіны.



Адноўлены Любчанскі замак.

пару метраў бэлек пафарбаваны табой. Замак рэальны, а не паветраны.

Мне спадабалася валанцёрская праца. Гэта яскравае ўсведамленне, што ты робіш штосьці карыснае на старажытным муры і пры тым абсалютна па сваёй ахвоце, не беручы і не чакаючы ніякіх грошай. Гэта дае неймавернае адчуванне свабоды. А яшчэ Любчанскі замак падарыў мне першае беларускамоўнае кола сяброў.

...Неяк мяне падвозіў адзін з жыхароў Любчы. Ён распавядаў, што напачатку да новага занятку братоў Пячынскіх (Івану Антонавічу дапамагае яшчэ і Генадзь Антонавіч) адносіліся досыць паблажліва. Маўляў, няма чаго рабіць мужыкам, дык з замкам пачалі забаўляцца. Але калі прайшлі гады, з'явіліся спонсары, якія ўклалі свае грошы ў аднаўленне, а Любчанскі мур унеслі ў дзяржаўную праграму «Замкі Беларусі», тады лёгкая іронія мясцовых замянілася глыбокай павагай і нават крышачку зайздрасцю. Учора Пячынскія былі дзівакамі, што вывозілі смецце з руін. А сёння



Гальшанскі замак у віртуальнай рэканструкцыі.

Дырэктар фонду спачатку на многае вырашыў не замахвацца. Пасля навядзення элементарнага парадку, вырашылі паспрабаваць аднавіць Кутнюю вежу (пазней яна атрымае назву Валанцёрская, бо ў многім была зроблена сіламі добраахвотнікаў).

Памятаю свой першы прыезд у валанцёрскі летнік у Любчу. Напярэдадні запаўняла анкету, пісала, чым магу быць карыснай у справе аднаўлення. А калі мне патэлефанаваў тагачасны каардынатар валанцёрскай групы Аляксей Скок і паведаміў, што ў пачатку жніўня магу прыязджаць, я была на сёмым небе ад шчасця. Мае прадчуванні апраўдаліся. Жыццё сапраўды робіцца іншым, калі пачынаеш мецць «уласны» замак, дзе хоць бы адна цаглінка ўкладзена тваімі рукамі, хоць бы

гэта людзі, у якіх усё атрымалася. Аднавіць цэлы замак. Гэта прэцэдэнт не толькі для ўсёй Беларусі. Унікальны выпадак і для блізкага замежжа, калі цэлы замак аднаўляецца сіламі прыватнай асобы (натуральна, дзякуючы камандзе, якую ўдалося сабраць, пры падтрымцы Прыёрбанка, фірмы Caparol, БНТУ і БДТУ і многіх іншых устаноў і асоб).

Усё гэта яшчэ раз пацвярджае, што паміж дзівацтвам і вялікімі ўчынкамі, якія змяняюць ход гісторыі хоць бы ўласнага рэгіёна, усяго адзін крок.

Але што рабіць, калі «ўласнага» замка не маеш?.. Можна яго дадумаць, як зрабіў Ахрэм Белабровік. Нядаўна ў Нацыянальным гістарычным музеі была прэзентавана 3D-рэканструкцыя (віртуальная) Крэўскага і Гальшанскага замкаў. У рэальнасці сёння ад іх засталіся толькі «рамантычныя руіны». Аднак з дапамогай спецыяльных акуляраў можна ўбачыць гэтыя замкі такімі, якімі яны былі колькі стагоддзяў таму.

У змакетаваным свеце адчуваецца веліч, размах, маштаб старажытных муроў. Гэта вам не маляваныя дэкарацыі для заакіянскіх галівудскіх фільмаў. Гэта злепак нашай уласнай гісторыі. Яе подых з даўніх часоў, што дзіўным чынам данесціда да нас, сучасных, што жывуць у XXI стагоддзі.

Убачыць такі віртуальны замкавы свет — не менш карысна, чым прачытаць цэлую кнігу пра старажытны мур. Бо яскрава праглядаецца эпоха, і робіцца зразумелым, што мелі мы нешта ну вельмі адметнае!

Ахрэм Белабровік — таксама энтузіяст. Ён рабіў свой праект у вольным ад працы час. Сядзеў вечарамі і, нібы той муляр, што па цаглінцы збірае сцяну, па пікселі вымалёўваў спачатку Крэўскі, а затым і Гальшанскі замкі.

Хтосьці можа задацца пытаннем, а навошта ўвогуле рабіць віртуальныя замкі? Гэта ўсяго выява, хоць і цікавая. Ці не лепш было б укласці грошы і час у рэальнае аднаўленне ці набыццё старажытных прадметаў? Адказ на такія магчымыя пярэчанні добра сфармуляваў дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Артур Рыжкоў: «У наш час трэба выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі для візуалізацыі нашай гістарычнай спадчыны. І са свайго боку кансерваваць тое, што засталося... Бо энергетыка захоўваецца ў тых руінах, што бачылі сваіх уладароў, прачулі тагачасныя падзеі і перадаюць атмасферу. Трэба спыніць разбурэнне. І больш актыўна стварыць розныя калязамкавыя турыстычныя маршруты... Пасля таго, як я пагуляў у гэтых акулярах, мне хочацца сапраўды з'ездзіць у тыя замкі, падняць гістарычныя матэрыялы, даведацца ўсё пра іх гаспадароў. Мяне гэта ўражвае».

Як бачым, з віртуальнага, добра ўяўленага і пачынаецца ўсё рэальнае. Спачатку мара, тое, што імкнецца схавацца за далягляд. Але ты, вынасіўшы і выпесціўшы ў сваім сэрцы ідэю, пачынаеш яе ўвасабляць. Крок за крокам. Нібы дзівак. А можа той, каму ўдасца павярнуць ход гісторыі хоць бы на адным квадратным метры.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

nina@zviazda.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62

**Продавец:** ОАО «АТЭК» г. Витебск, ул. Терешковой, д. 11, 8 (0212) 26-12-10

**Лот №1.** Изолированное помещение с инв. №200/D-182194 площадью 122,6 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, 11-3, наименование — помещение специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, назначение — помещение транспортного назначения. Примечания: помещение ТП, площадью 19,8 кв. м — помещение общего пользования между изолированными помещениями: 1, 2 ,3, 4, 5, 6, 7, которое в случае возникновения в капитальном строении совместного домовладения будет относиться к общему имуществу. Вход в указанное помещение предусмотреть посредством установления сервитута через тамбур площадью 2,5 кв. м и коридор площадью 24,1 кв. м Помещение РУ-2 площадью 9,5 кв. м — помещение общего пользования между помещениями: 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, которое в случае возникновения в капитальном строении совместного домовладения будет относиться к общему имуществу. Вход в указанное помещение предусмотреть посредством установления сервитута через помещение для ремонта и технического обслуживания автомобилей площадью 112,1 кв. м. Обременение: договор аренды сроком по 31.12.2017 включительно. **Нач. цена:** 47 630 руб. без НДС. Задаток: 4 763 руб.

**Лот №2.** Изолированное помещение с инв. №200/D-182199 площадью 96,5 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, 11-5, наименование — помещение специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, назначение — помещение транспортного назначения. Примечания: прочие конструктивные элементы: крыльцо(а). Помещение ТП, площадью 19,8 кв. м — помещение общего пользования между изолированными помещениями: 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, которое в случае возникновения в капитальном строении совместного домовладения будет относиться к общему имуществу. Вход в указанное помещение предусмотреть посредством установления сервитута через тамбур площадью 2,5 кв. м и коридор площадью 24,1 кв. м. Помещение РУ-2 площадью 9,5 кв.м — помещение общего пользования между помещениями: 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, которое в случае возникновения в капитальном строении совместного домовладения будет относиться к общему имуществу. Вход в указанное помещение предусмотреть посредством установления сервитута через помещение для ремонта и технического обслуживания автомобилей площадью 112,1 кв. м. Помещение венткамеры площадью 98,5 кв. м — место общего пользования между изолированными помещениями 1 и 5. Вход в указанное помещение предусмотреть посредством установления сервитута через помещение для ремонта и технического обслуживания автомобилей площадью 100,7 кв. м. **Нач. цена:** 37 730 руб. без НДС. Задаток: 3 773 руб.

**Лот №3.** Изолированное помещение с инв. №200/D-182201 площадью 83,8 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, 11-6, наименование — помещение специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, назначение — помещение транспортного назначения. Примечания: прочие конструктивные элементы: крыльцо(а). Помещение ТП, площадью 19,8 кв. м — помещение общего пользования между изолированными помещениями: 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, которое в случае возникновения в капитальном строении совместного домовладения будет относиться к общему имуществу. Вход в указанное помещение предусмотреть посредством установления сервитута через тамбур площадью 2,5 кв. м и коридор площадью 24,1 кв. м Помещение РУ-2 площадью 9,5 кв. м — помещение общего пользования между помещениями: 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, которое в случае возникновения в капитальном строении совместного домовладения будет относиться к общему имуществу. Вход в указанное помещение предусмотреть посредством установления сервитута через помещение для ремонта и технического обслуживания автомобилей площадью 112,1 кв. м. Обременение: договор аренды сроком по 31.08.2018 включительно. **Нач. цена:** 32 560 руб. без НДС. Задаток: 3 256 руб.

**Лот №4.** Изолированное помещение с инв. №200/D-182191 площадью 497,1 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, 11-2, наименование — помещение специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, назначение — помещение транспортного назначения. Примечания: помещение ТП, площадью 19,8 кв. м — помещение общего пользования между изолированными помещениями: 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, которое в случае возникновения в капитальном строении совместного домовладения будет относиться к общему имуществу. Вход в указанное помещение предусмотреть посредством установления сервитута через тамбур площадью 2,5 кв. м и коридор площадью 24,1 кв. м. Помещение РУ-2 площадью 9,5 кв. м — помещение общего пользования между помещениями: 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, которое в случае возникновения в капитальном строении совместного домовладения будет относиться к общему имуществу. Вход в указанное помещение предусмотреть посредством установления сервитута через помещение для ремонта и технического обслуживания автомобилей площадью 112,1 кв. м. Обременение: договор аренды сроком по 04.01.2018 включительно. **Нач. цена:** 206 800 руб. без НДС. Задаток: 20 680 руб.

**Лот №5.** Изолированное помещение с инв. №200/D-182202 площадью 148,4 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Терешковой, 11-7, наименование — помещение специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, назначение — помещение транспортного назначения. Примечания: принадлежность помещения: пристройка. Помещение ТП, площадью 19,8 кв. м — помещение общего пользования между изолированными помещениями: 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, которое в случае возникновения в капитальном строении совместного домовладения будет относиться к общему имуществу. Вход в указанное помещение предусмотреть посредством установления сервитута через тамбур площадью 2,5 кв. м и коридор площадью 24,1 кв. м Помещение РУ-2 площадью 9,5 кв. м — помещение общего пользования между помещениями: 1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, которое в случае возникновения в капитальном строении совместного домовладения будет относиться к общему имуществу. Вход в указанное помещение предусмотреть посредством установления сервитута через помещение для ремонта и технического обслуживания автомобилей площадью 112,1 кв. м. **Нач. цена:** 57 530 руб. без НДС. Задаток: 5 753,30 руб.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 27.09.2017 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 12.09.2017 с 8.30 по 26.09.2017 до 17.30. Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке объектов продажи, изготовлению технической документации на изолированные помещения, оплата НДС сверх цены продажи объекта.

